СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 8.22, 15.48, 7.26;
Віцебск — 8.20, 15.30, 7.10;
Магілёў — 8.11, 15.37, 7.26;
Гомель — 8.01, 15.43, 7.42;
Гродна — 8.36, 16.05, 7.29;
Брэст — 8.28, 16.14, 7.46.
МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 16 снежня.
ІМЯНІНЫ:
Сафонія, Савы, Фядула, Івана, Фёдара;
Альбіны, Эдзіславы.

ЗВЯЗДА

16 СНЕЖНЯ 1992 г.
серада, № 248 (22026)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАЛАС

ПРЭМ'ЕР АДПРАЎЛЯЕЦЦА Ў КІЕЎ

Як стала вядома карэспандэнту БЕЛІНФАРМа, як мяркуецца, у чацвер, 17 снежня, кіраўнік беларускага ўрада Вячаслаў Кебіч вылеціць у Кіеў для падпісання пакета двухбаковых дакументаў са сваім украінскім калегам Леанідам Кучмой. Гэты візіт намячаўся на больш ранняя тэрміны, але затрымка была выклікана хваробай украінскага прэм'ера.

Ёсць усе падставы чакаць, што сустрэча кіраўнікоў урадаў дзвюх дзяржаў будзе плённай. Выступаючы ў мінулую нядзелю ў папулярнай праграме «Вынікі» па Астанкінскім тэлебачанні, Леанід Кучма сказаў, што ён вельмі песімістычна бачыць будучыню СНД і аддае яўную перавагу двухбаковым перагаворам. «Калі мы сустракаемся з Гайдарам або Вячаславам Францавічам з Беларусі, мы заўсёды ведаем, аб чым гаварыць», — заўважыў прэм'ер-міністр Украіны.

БЕЛІНФАРМ.

СА СВЕТУ ПА ДОЛАРУ— ЗАМКУ РЭКАНСТРУКЦЫЯ

Днямі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь атрымала па лініі ЮНЕСКО 25 тысяч долараў, якія прызначаны спецыяльна на рэстаўрацыю Мірскага замка. Усяго на аднаўленне гэтага сусветна вядомага гістарычнага помніка з дапамогай спонсараў з Італіі, Германіі і іншых краін «далёкага» замежжа чакаецца паступленне паўмільёна долараў.

«З кім вы звязваеце надзеі на выхад Беларусі з крызісу?»

Такое апытанне правёў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД). Усяго па квотна-прапарцыянальнай выбарцы было апытана 1.130 чалавек, кантралявалася шэсць параметраў выбаркі, адхіленне параметраў ад даных дзяржаўнай статыстыкі не перавышае трох працэнтаў. Вось як размеркаваліся адказы (у працэнтах).

З урадам рэспублікі	34,0
З замежным капіталам	31,3
З беларускімі прадпрымальнікамі	29,0
З кіраўніцтвам дзяржпрадпрыемстваў	16,0
З Вярхоўным Саветам	14,2
З арміяй, КДБ	8,6
З палітычнымі партыямі	5,5
З судовай сістэмай	4,8
Са СМІ	2,7

(РІД).

С. С. Шушкевіч не прывёз у Горкі ні масла, ні цыгарэт. Ён проста хацеў параіцца з народам

СТАРШЫНЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА НАВЕДАЎ ГОРАЦКІ РАЁН

1.

Па-першае, гэтага рэпартажу магло і не быць. Дзесьці на сярэдзіне шляху наш «рафік» трапіў у пробку, якая расцягнулася кіламетра на паўтара: пад'ём, галалёдзіца, а дарогу пяском ніхто не пасыпаў. Па-другое, рэпартаж усё ж ёсць, бо «рафік» мы працягнулі на руках і паехалі далей. Бог злітаваўся над намі і нашымі чытачамі. Потым злітаваліся і дарожнікі — падсыпалі пяску. Так што прадстаўнічы картэж мы дагналі. Ужо ў Горках. На баль з карабля мы, праўда, не трапілі — Старшыня ўжо пагутарыў з мясцовымі ўладамі. Па натоўпу ля магазіна вызначылі, што С. С. Шушкевіч там.

Падышлі якраз тады, калі пачалася гутарка з народам. Наогул, была не гутарка, а маналогі, ад якіх Старшыня з гумарам адбіваўся. Накшталт:

— Гэта ж жыць немагчыма, што робіцца ў гандлі! Прывозяць масла, а куды яно знікае? Трэба навесці парадак!

— Вы за расстрэл на месцы?

— Ды не... Але меры прыняць трэба...

Бабуля побач са мною штурхала ў бок суседа-мужыка: «Ты ж пра курыва спытай!» А мужык слаба адбіваўся: «Я не куру. Ідзі сама пытай, ён табе што — машыну цыгарэт прывязе?»

Сустрэча хутка закончылася, і мы паехалі ў племгас імя славутага лётчыка В. Чкалава. Трэба думаць, перадаваю мясцовую гаспадарку.

2.

Савецкага чалавека не пераробіш за некалькі гадоў, і як у ваду глядзеў паэт, калі пісаў: «Гвозди бы делать из этих людей». Маю на ўвазе: па прычыне іх бясконцага цярпення і непахіснай веры ў тое, што ў нас усё залежыць ад аднаго чалавека. Самага першага і самага галоўнага. Таму што ў племгасе было прыкладна тое ж, што і ля горацкага магазіна.

Калі С. С. Шушкевіч павітаўся з жанчынамі-даяркамі, яны зладжаным хорам загаласілі:

— Хлеб возяць два разы на тыдзень!

— Мы на рабоце, а пенсіянеры ўсё размятаюць!

— Зарплата маленькая!

Тут Старшыня таксама нічога не мог абяцаць. І было б дзіўна, калі б гэта зрабіў, бо ён — усяго толькі Старшыня Вярхоўнага Савета. А не, скажам, сельсавета.

«Атака» скончылася без поспеху. Станіслаў Станіслававіч палез у «Волгу», а мужчына, што ўвесь час стаяў за спінамі даярак і хітра ўсміхаўся, паўшчуваў іх: «Што ж вы стаялі, соплі жавалі? Чаго маўчалі?»

(Заканчэнне на 3-й стар.).

На здымках: С. С. Шушкевіч у Горацкім раёне.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

РАДЫЁФАКТ

СТАРШЫНЯ ПЛАНАВАЙ І БЮДЖЭТНА - ФІНАНСАВАЙ КАМІСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РАМАН УНУЧКА ў інтэрв'ю «Радыёфакту» пазнаёміў з законапраектам «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях падаткаабкладання». Гэтым дакументам, у прыватнасці, прадугледжваецца знізіць падатак на дабаўленую вартасць з 28 да 25 працэнтаў, вызваліць ад яго работнікаў творчых саюзаў. Прадугледжаны змены і ў падаходных падатках для грамадзян.

***

ПРАЦЯГВАЕЦЦА СПАД ВЫТВОРЧАСЦІ МАЛАКА І МЯСА У ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ. Штомесяц для самазабеспячэння насельніцтва не лапае каля 14 тысяч тон малака, з-за чаго спынена вытворчасць масла. Рацыёны кармлення на фермах як ніколі бедныя. Ці то жартам, ці ўсур'ёз на апошнім пасяджэнні аблвыканкома адзначалася, што час уводзіць новую адзінку вымярэння надояў — у шклянках. Усё часцей чуюцца выказванні аб тым, што мы бяднеем з кожным днём. А між тым, у Гродна на рэдкасць хутка разышліся кватэры па камерцыйных цэнах. На апошнім аўкцыёне пададзена 8 кватэр палепшанай планіроўкі. Калі ў ліпені цана на іх складала 600—800 тысяч рублёў, то зараз двухпакаёвыя кватэры купілі за 1,5 мільёна, трохпакаёвую — за 1 мільён 700 тысяч рублёў.

***

У ВАРАНАВІЧАХ ПАЧАСЦІЛІСЯ ВЫПАДКІ ЗАХВОРВАННЯ НА КАРОСТУ. Са скаргамі на гэту хваробу ў скурдыспансер звярнуліся сёлета больш за 500 чалавек. Прычыны хваробы розныя: адны звязваюць гэта з нервовасцю і неўладкаванасцю ў нашым грамадстве, другія — з павышэннем цэн на паслугі лазні.

***

ПРЫЦІХЛЫЯ БЫЛО РАЗМОВЫ АБ НЛА АДНАВІЛІСЯ У МІЗРСКІМ РАЁНЕ. На днях каля вёскі Круні адбылася сустрэча з НЛА вадзіцеля легкавога аўтамабіля, які ўбачыў яркі зялёны шар матавага колеру. У адказ на светлавыя сігналы вадзіцеля шар таксама пачаў мільгаць і паляпіў убок. Відэвочцам здарэння стаў і другі вадзіцель, які пад'ехаў. Такім чынам двое зусім незнаёмых людзей пацвердзілі сустрэчу з неапазнаным лятаючым аб'ектам.

Літоўскі партовы горад Клайпеду пакінулі апошнія часці расійскіх пагранічнікаў. Пачалася перадача Міністэрству аховы краю Літвы таксама аб'ектаў і маёмасці 107-й мотастралковай дывізіі, якая размешчана амаль у центры Вільнюса.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

МЕСЯЧНЫЯ ДАЧНІКІ

У Волагдзе мясцовы кааператыў займаўся продажам участкаў на... Месяцы. Участкі былі танныя, і распродаж заняў усяго некалькі дзён. Грошы за афармленне здзелак, паводле запэўнівання супрацоўнікаў кааператыва, пайшлі ў фонд азелянення Месяца: на гэтыя сродкі павінны быць пасаджаны першыя месячныя лесапалосы.

ВАГОНЫ БЯРУЦЬ ШТУРМАМ

Адміністрацыя пасёлка Забайкальск просіць кіраўніцтва Чыцінскай вобласці прадаставіць ёй паўнамоцтвы для ўвядзення надзвычайнага становішча: на вакзале Забайкальска і пад'язных чыгуначных пуцях штодзённа грымяць стрэлы. Злачынцы, узброеныя аўтаматычнай зброяй, бяруць штурмам таварныя вагоны.

ГАЗЕТ УСЁ МЕНШ

Знікаюць з суверэннай Латвіі і цэнтральныя газеты былога Саюза. Па словах начальніка вытворчага аддзела Рыжскага Дома друку, гэтыя выданні не ў стане аплаціць усяляхія мытныя пошліны за праваз паперы. Паўстае пытанне аб жыцці і смерці «замежных» газет у Латвіі.

РУСАФОБІЯ!

У Таліне загадчыца дзіцячых ясляў адмовілася прыняць у сваю ўстанову рускую дзяўчынку, растлумачыўшы, што «ў яе ўжо і так трое рускіх».

НАПЕРАДЗЕ — МАЭСТРА

У Латвіі па выніках апытання самым папулярным палітыкам лістапада аказаўся міністр культуры рэспублікі, знакаміты кампазітар Раймандс Паўлс. На другім месцы Яніс Юрканс, які толькі што падаў у адстаўку з пасады міністра замежных спраў. Старшыня Вярхоўнага Савета Анатоль Гарбуноў аказаўся трэцім, а прэм'ер-міністр Іварс Годманіс — толькі дзесятым.

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Пры дэфіцыце часу

Пасля трохдзённых мікракакулаў зноў аднавіла сваю работу сесія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Найбольш хвалюючыя народ рэспублікі пытанні знаходзяць водгук і ў гэтай авальнай зале, дзе засядаюць парламентарыі. І перш за ўсё, вядома, праблемы эканомікі і сацыяльнага становішча людзей, дзе абстаноўка катастрафічна пагаршаецца. Ці не таму з такой увагай было ўспрынята выступленне ў «Розным» народнага дэпутата Міхаіла Васілеўскага аб становішчы спраў у энергетыцы рэспублікі ўвогуле і на Лукомскай ДРЭС, дзе выпрацоўваецца каля 45 працэнтаў усёй электраэнергіі — у прыватнасці. Як засведчыў дэпутат, у сувязі з той неразбярыхай, што склалася ў справе ўзаемных разлікаў за паставляемую прадукцыю, Лукомская ДРЭС завінавацілася Расіі за мазут і газ недзе каля 3 мільярдаў рублёў. Ужо цяпер калектыву даводзіцца працаваць, што называецца я[illegible]. Навісае рэальная небяспека спынення паставак паліва наогул, калі не вырашыцца пытанне з аплатай. Тое ж самае і ў адносінах да паставак камплектуючых частак, металапракату, электродаў, іншых матэрыялаў, неабходных для правядзення капітальнага рамонту электраабсталявання, дзе таксама не вырашаецца пытанне разлікаў за пастаўкі.

Не менш вострымі былі і іншыя выступленні народных дэпутатаў, што атрымалі слова ў «Розным». Гаварылі пра тое, што найбольш набалела, што хвалюе выбаршчыкаў.

Затым дэпутаты перайшлі да працягу абмеркавання праекта закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс законаў аб працы Рэспублікі Беларусь», які прапанаваў старшыня Камісіі па пытаннях працы, цэн, занятасці, сацыяльнай абароненасці насельніцтва Аляксандр Сасноў. Аб аб'ёме, змесце і важнасці гэтага закона можна меркаваць хоць бы па тым, што праект абмяркоўваецца ўжо не першы дзень. Вось і на ўчарашнім пасяджэнні зноў разгарэліся спрэчкі па асобных артыкулах, і палажэннях праекта. Асабліва шмат прапаноў, нярэдка дыяметральна процілеглых, было выказана пры абмеркаванні артыкула, у якім

(Заканчэнне на 3-й стар.).

КАРОВЫ ТАКСАМА ХВАРЭЮЦЬ

МІНСК. Міншчына лідзіруе ў рэспубліцы па колькасці кароў, хворых на лейкоз—9 працэнтаў ад агульнага статка. Напрыклад, толькі ў Нясвіжскім раёне Мінскай вобласці на лейкоз хварэюць 1.940 кароў і 198 цялушак. У астатніх рэгіёнах Беларусі працэнт хворых жывёл звычайна не перавышае 2—4 працэнтаў ад статка.

СПРАВЫ ПАРКАВЫЯ

ШКЛОЎ. Мясцовы райвыканком сваім рашэннем абвясціў старажытны парк горада помнікам прыроды мясцовага значэння. Ахоўваць помнік-парк, які паступова прыходзіць у запусценне, цяпер будзе вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Нягледзячы на тое, што райвыканком надаў парку статус помніка ўсяго толькі мясцовага значэння, на самай справе з-за сваёй старажытнасці і прыродных каштоўнасцей ён уваходзіць у дзесятку лепшых паркаў Беларусі.

У транспартнай гаспадарцы—папаўненне

Гэтымі днямі статус гарадскога транспарту атрымалі ў Мінску не толькі аўтобусы, тралейбусы і трамваі, але і... электрычкі.

У сувязі з рэзкім скачком цэн на энерганосьбіты значна скарацілася колькасць аўтобусаў, што выходзяць кожны дзень на маршрут. Гарадскі транспарт працуе з перагрузкамі. Каб як-небудзь залатаць гэту «дзірку», Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі адкрыла рух электрапаязду, які будуць курсіраваць не толькі па суседніх са сталіцай раёнах, але і ў межах самога горада.

Нават у гадзіны «пік» мінчане змогуць дабірацца да работы ў другі канец горада не ў транспартнай таўкатні, а з умераным чыгуначным камфортам. І што не менш важна — без перасадак. Будзе каштаваць гэта гараджанам у некаторых выпадках нават танней, чым паслугі прывычных усім аўтобусаў. Так, ад інстытута культуры да Сцяпянкі можна даехаць усяго за 2 рублі, а ад Калядзіч да Ратамкі — за 5. Пры гэтым трэба ўлічыць, што час, затрачаны на дарогу ў чыгуначным транспарце, эканоміцца, як мінімум, на трэць.

Сяргей ЗАЯЦ. (БЕЛІНФАРМ).

ТЫ—МНЕ, Я—ТАБЕ

ПІНСК. На сённяшні дзень горад завінаваціўся Расіі 411 мільёнаў рублёў, а ўвогуле ўсім краінам Садружнасці — каля 835 мільёнаў рублёў. Аднак пры ўсёй бесперспектыўнасці гэтых лічбаў ёсць у іх і адваротны станоўчы бок. Так, Расія павінна аддаць Пінску доўг у памеры 762 мільёны «драўляных», а ўсе краіны СНД—больш за паўтара мільярда рублёў. Так што сальда, як кажуць, на нашу карысць.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ. З КАЛУМБІЯЙ

Як паведамілі агенцтву БелаПАН у Міністэрстве замежных спраў Беларусі, Рэспубліка Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны на ўзроўні пасольстваў з Калумбіяй. Адпаведнае сумеснае камюніке падпісалі пастаянныя прадстаўнікі гэтых дзвюх дзяржаў пры ААН — Генадзь Бураўкін і Луіс Фернанда Харамільля. Гэта ўжо 68-я краіна, з якой Беларусь устанавіла дыпламатычныя адносіны.

БелаПАН.

ДЫЯЛОГІ «ЗВЯЗДЫ»

Сяргей ЗАКОННІКАЎ:

«ІНТЭЛІГЕНТНАСЦЬ— ГЭТА ПЕРШ ЗА ЎСЁ СУМЛЕННАСЦЬ...»

Наша складанае, неардынарнае, супярэчлівае жыццё ставіць сёння шмат пытанняў. Такіх жа складаных, неардынарных, супярэчлівых. Ставіць перад усімі разам і кожным з нас паасобку. І адказы на іх мы таксама шукаем як разам, так і паасобку. Зрэдку знаходзім, зрэдку—не. І не віна наша ў гэтым, а—бяда.

З бяды ж, у якую мы трапілі, лепш за ўсё шукаць выйсце разам. Тады і памылак будзе менш, і прыкрых прамашак. Бо для нас тыя памылкі і прамашкі надзвычай балючыя і — проста недаравальныя. Шмат ужо нацярпеліся мы, шмат адпакутвалі. А хочацца ж людзьмі звацца...

Заўсёды, ва ўсе часы і ва ўсіх народаў праваднікам святла і дабрыні была інтэлігенцыя. На вялікі жаль, у нас аб гэтым і сёння мала хто задумваецца. А дарэмна... Менавіта ж інтэлігенцыя ВЫРАЗНЕЙ ПРАДЧУВАЕ будучыя катаклізмы, ПЕРШАЙ АДЧУВАЕ палітычныя і сацыяльныя перамены... Першай, на жаль, становіцца яна і ахвярай тых катаклізмаў і перамен.

Пагаварыць аб усім гэтым і многім іншым з вядомым беларускім паэтам Сяргеем ЗАКОННІКАВЫМ мне хацелася даўно. І на гэта ёсць шмат падстаў. Па-першае, ведаю яго даўно, за станаўленнем, ростам і ўдасканаленнем ягонага паэтычнага таленту таксама сачу ўжо трэцяе дзесяцігоддзе. Па-другое, і чалавек ён цікавы, таварыскі, з неардынарным пісьменніцкім лёсам... А тут яшчэ і нагода выдалася: часопісу «Полымя», які Сяргей Законнікаў рэдагуе роўна шэсць гадоў, спаўняецца 70 гадоў.



— Давайце пачнём гутарку з некалькі агульнага, аднак, несумненна, важнага пытання: якім бачыцца вам лёс беларускай інтэлігенцыі на працягу апошніх 70 гадоў? Чаму? Мне здаецца, тут не ўсё яшчэ сказана, ды і вам асабіста ёсць што сказаць на гэты конт...

— Цяжка нават агульным, штрыхамі прасачыць надзвычай трагічны лёс беларускай інтэлігенцыі. Ніколі ў яе не было нармальных умоў для таго, каб набраць моц, разгарнуцца на поўную сілу. Інтэлігенцыя можа расці колькасна і плённа развівацца ў незалежнай, самастойнай дзяржаве. Тое становішча, у якім беларускі народ быў не адно стагоддзе, не стымулявала росту творчых сіл.

Прарыў адбыўся ў канцы XIX і на пачатку XX стагоддзя. Беларускае адраджэнне набірала моц, каб у 20-я гады ўзняць магутную хвалю нацыянальнага абуджэння, прытоку ў літаратуру, мастацтва, навуку, адукацыю, медыцыну, многіх тысяч таленавітых сыноў і дачок народа. Яны сталі свядомымі, актыўнымі будаўнікамі культурнага жыцця рэспублікі. За гэты час было зроблена нямала: адкрываліся беларускія школы, вучылішчы, тэхнікумы, ВНУ, выдавецтвы, музеі, бібліятэкі. Нарэшце беларусы адчулі сябе людзьмі. Аднак сонца глядзела ў наша аконца нядоўга. «Бацька ўсіх народаў» выдаў тэзіс пра ўзмацненне класавай барацьбы. І гэтая барацьба закінула. Першымі ў сталінскія турмы трапілі тыя, хто быў на відавоку: прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, актывісты, наогул, адукаваныя людзі.

У трыццатыя гады гэтыя жорны закруціліся ў шалёным тэмпе, перамолваючы тых, хто быў аб'яўлены «ворагам народа», «нацдэмам», «контрэвалюцыянерам». Пачалася сапраўдная народная трагедыя.

— **Лёс трагічны, згодзен з вамі. І ўсё ж цяпер, хоць і рухнула імперыя пад назвай Савецкі Саюз, хоць, як можа падацца мешчаніну, не да высокага стылю, давайце пройдзем да дня сённяшняга. Якім бачыцца вам ідэал беларускага класічнага інтэлігента? Можа, слова «ідэал» і гучнае, але ж рэальнае... Ну, калі не ідэал, то ўзор. Не нейкага аморфнага, «мёртвага», застылага, а ўзор жывога, рэальнага для часу, дзейнага беларуса-інтэлігента...**

— Пытанне вы задаяце некалькі няпростае, настолькі і важнае. Тое вынішчэнне разумнейшых, сумленнейшых, пра што мы ўжо гаварылі, абразлівыя адносіны да інтэлігенцыі з боку лідэраў Камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы (успомніце выразы, адрасаваныя ёй Леніным, Сталіным і іншымі «правадырамі»!), узвелічэнне і ўсхваленне не лепшых чалавечых, гуманістычных якасцей, не інтэлекту, розуму, таленту, майстэрства, а «класавай чысціні», і прывялі да заняпаду наша грамадства. Калі б яно, грамадства, развівалася ў нармальных умовах, то, несумненна, культурны ўзровень любога народа былога СССР быў бы намнога вышэйшы. І ў самім асяроддзі інтэлігенцыі ўвесь час, як кажуць, планка паніжалася і паніжалася. Арыентацыя была не на сапраўдных інтэлігентаў старое закалкі, а на тое, як бы прыстасавацца да ўлады, дагадзіць «сильным мира сего». Калі героямі савецкага народа былі неадукаваныя, абмежаваныя ў культурным развіцці, але крыважэрныя і цынічныя «жалезныя наркомы», то пра што можа ісці гаворка. На вялікі жаль, мы і сёння бачым, як адносяцца да культуры многія кіраўнікі. А таму і ў іншых сферах жыцця маем сумныя вынікі.

Сёння інтэлігентнасць многіх людзей заключаецца толькі ў тым, што яны маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі. Але дыплом—гэта яшчэ не ўсё, ён аўтаматычна не з'яўляецца пропускам у шэрагі сапраўдных інтэлігентаў.

Або, як я магу лічыць беларускім інтэлігентам чалавека, які хоць і скончыў дзве «цывільныя» ВНУ ды яшчэ ў дадатак і ВПШ, але з пагардаю ставіцца да законаў, да маралі, нахабна крадзе народнае дабро і ў той жа час цынічна аплёўвае тую зямлю, тых людзей, з асяроддзя якіх ён выйшаў сам, розумам і рукамі якіх усе гэтыя шчадроты створаны? А такіх «інтэлігентаў»—былых і сённяшніх, малых і вялікіх наменклатуршчыкаў — процьма. Раней яны баяліся пакласці на стол партбілет, страціць утульнае, з хлебам і маслам месцейка. А цяпер, у бязладдзі і вэрхале, якія яны самі і ствараюць, адчулі поўную свабоду, іхні апетыт стаў воўчым.

Інтэлігентнасць — гэта перш за ўсё сумленнасць, высокая патрабавальнасць да сябе. А потым ужо ідуць належны інтэлектуальны ўзровень, кампетэнтнасць.

Акрамя гэтых якасцей, я не ўяўляю беларускага інтэлігента без любові да роднай зямлі, без ведання гісторыі свайго народа, без апантанага, актыўнага жадання зрабіць усё, каб наша Айчына стала сапраўды квітнеючай, заможнай, цывілізаванай, культурнай дзяржаваю. Я ўжо не кажу пра павагу і ўвагу да людзей, пра дабрыню, спагаду і міласэрнасць. Гэта тычыцца кожнага чалавека.

— **У народаў, якія паважаюць самі сябе, спадчына, антычнасць, гістарычная даўніна з'яўляюцца бессмяротнымі. А ў нас? Ці здольныя мы адвыкнуць—адзін раз і назаўсёды — ад перапісвання гісторыі на розныя лады? І тут жа яшчэ адно пытанне, якое, на маю думку, мае з папярэднімі прамую залежнасць. Як вы мяркуеце: ці перажыве наша беларуская культура (у самым шырокім сэнсе слова) тую дзяржаўнасць (па-руску — государственность), у якую наш край трапіў у 1917-м? Ці выйдзе, урэшце, на новы, шырокі прастор?**

— Гісторыя беларускага народа, яго мовы, культуры надзвычай трагічная. Яна ўвабрала ў сябе і слаўныя, гераічныя старонкі змагання са шматлікімі ворагамі за сваю годнасць, і бяспрыкладны адраджэнцкі ўздым скарынавага часу, і бурлівае абуджэнне нацыянальнай свядомасці ў XIX і на пачатку XX стагоддзяў, і балючыя для сэрца кожнага беларуса прыклады гвалту і знявагі ў дачыненні да нашых продкаў. Жыць паміж ваяўнічых і агрэсіўных суседзяў нялёгка. Праз нашу зямлю, якая ляжыць на скрыжаванні шляхоў, на працягу многіх стагоддзяў безсупынку пракочваліся вогненным валам малыя і вялікія войны, знішчаючы беларусаў, а таксама набытак іхніх працавітых рук, розуму і таленту. Ці ж не зашчыміць сэрца ад такой згадкі: калі б народ жыў у нармальных умовах, то сёння беларусаў магло б быць 35 мільёнаў?! А багацці матэрыяльнай і духоўнай культуры?! Колькі іх разбурана, спалена, знішчана альбо раскідана па ўсім белым свеце!

Не лепшым часам для нашай культуры была і савецкая «дзяржаўнасць», пра якую вы кажаце. Канешне ж, дзеля справядлівасці нельга сцвярджаць, што за 70 гадоў савецкай улады ў развіцці адукацыі, культуры не было нічога станоўчага. Многія выхадцы «з нізоў» атрымлівалі адукацыю, набывалі розныя новыя прафесіі і г. д. Але адраджэнне, беларусізацыя, якія хораша распачаліся ў 20-ыя гады, хутка захлібнуліся ў крыві сваіх творцаў, лепшых сыноў і дачок Беларусі.

Паслугачы бальшавіцкай ідэі вялі барацьбу на ўсе франты: і з храмамі, і з кнігамі, і з моваю, і з нацыянальна свядомымі людзьмі. А пазней у іхні хваравіты розум прыйшла абсурдная новая ідэя зліцця розных моў, культур, народаў, каб нарадзіць уніфікаваны савецкі народ з адной моваю і культураю—рускаю. У плане русіфікацыі мясцовае чыноўніцтва пры дзейснай падтрымцы з Масквы праявіла самую вялікую актыўнасць, далёка абагнала ўсе рэспублікі былога СССР. Дайшло да таго, што ў гарадах не стала ніводнай беларускай школы, вучылішча, тэхнікума, ВНУ, а ў вёсцы школы таксама амаль усе перайшлі на рускую мову навучання. Родная мова была выгнана адусюль. І сёння, калі разглядаць наша грамадства з пункту гледжання нацыянальнай мовы, культуры, трэба праўдзіва канстатаваць, што нацыянальнай меншасцю стала ў рэспубліцы карэннае насельніцтва—самі беларусы, многія з якіх не валодаюць роднаю моваю, не ведаюць уласнай гісторыі, згубілі нацыянальныя арыенціры.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

Канец дымным шлейфам?

Адной з адметных прыкмет Новалукомля да нядаўняга часу з'яўляліся даўжэзныя шлейфы дыму, што цягнуліся далёка за межы горада. Звычайна, яшчэ на пад'ездзе, калі не відно было 250-метровых комінаў Лукомскай ДРЭС, языкі дыму ўжо добра былі бачныя за дзесяткі кіламетраў. І раптам у час апошняга прыезду сюды над трубамі ДРЭС я не ўбачыў больш злавесных шлейфаў. Падумалася: мо станцыя не працуе? Варта здарыцца такому — і гэта раўназначна эканамічнай катастрофе, бо магутнасць ДРЭС — 2 мільёны 400 тысяч кілават. Потым высока над трубамі ўбачыў бялёсыя клубы. Значыць, усё ж дым ёсць, хоць яго і менш, чым ранней?..

— Так, многіх, хто даўно не быў на Лукомлі, адзіўляе адсутнасць традыцыйных дымавых шлейфаў, — гаворыць дырэктар Лукомскай ДРЭС Леў Аляксандравіч Жураўлёў. — Справа ў тым, што ўжо ўсе восем блокаў пераведзены з мазуту на газ. Вось і растаяў дымок. А тое, што недасведчаныя прымаюць за дым — бялёсыя клубы над трубамі, — гэта ў асноўным пара, якая ўтвараецца пры згаранні газу ў топках катлоў.

— І што дасць нашай эканоміцы такая рэканструкцыя? Як адаб'ецца на экалагічным стане наваколля?

— Калі гаварыць пра эканоміку, то пераход з мазуту на газ — справа выгадная. Раней, каб забяспечыць нармальную работу ДРЭС, у суткі неабходна было недзе каля 3 тысяч тон паліва. Мала таго, што сабекошт мазуту большы за газ, дык яшчэ і транспартаваць яго — справа няпростая. Штодзённа па аднаколейцы трэба было дастаўляць шэсць саставаў з цыстэрнамі, перакачваць мазут у спецыяльныя сховішчы, а потым адпраўляць назад парожняк. А тут, як кажуць, павярнуў кран — і паліва прама з трубапровода паступае ў катлы. Цяпер наконт экалогіі. Мы поўнасцю пазбавім сябе і навакольныя тэрыторыі ад такіх шкодных выкідаў, як вокіслы серы. Раней жа разам з дымам іх вылятала ў трубу недзе каля 120 тысяч тон у год. Усё гэта ў выглядзе кіслотных дажджоў потым асядала на зямлю. Газ у гэтых адносінах куды больш экалагічна чыстае паліва.

— Няпроста было вырашыць задачу па пераводзе станцыі на газ? Побач жа, здаецца, няма адпаведнага газаправода?

— Вядома, цяжкасцей хапала. Спыніліся на тым, што найбольш зручнае месца — Крупскі раён, дзе праходзіць магістральны газаправод Таржок—Мінск — Івацэвічы. Адсюль і пачалі пракладваць ужо свой газаправод непасрэдна на станцыю. Усяго за некалькі месяцаў удалося ажыццявіць гэтую справу. Траса няпростая: балоты, рэчкі. Словам, газавікі пастараліся на славу.

— А хто займаўся пераводам блокаў на газ непасрэдна на станцыі?

— Тут асноўны аб'ём работы выканалі будаўнікі арэнднага прадпрыемства «Лукомльэнергамантаж». Мала таго, што яны ўкладліся ў тэрмін, дык пры гэтым прадэманстравалі яшчэ і высокую якасць будаўніча-мантажных работ. Праўда, здзіўляцца няма чаму, бо спецыялісты тут падабраліся высокага класа, у многіх за плячамі гады работ на буйнейшых новабудоўлях былога Саюза, у тым ліку і на Смаленскай атамнай станцыі. Яны ж цяпер пераводзяць на газ і Полацкую ЦЭЦ. І тут нямала сваіх праблем, бо калі гэту справу не вырашыць ужо да канца бягучага года, пад сумненне будзе пастаўлена задача цеплазабеспячэння шматтысячнага горада — мазуту не хапае.

— Але ж і з падачай газу могуць быць праблемы. І тады...

— Яны і цяпер існуюць, гэтыя самыя праблемы. Пакуль больш-менш здавальняюча забяспечваецца нармальная работа на газавым паліве толькі чатырох блокаў. Праўда, нам абяцаюць, што ў хуткім часе гэта задача будзе вырашана поўнасцю: на ўрадавым узроўні вядуцца перагаворы па забеспячэнню газам рэспублікі. У якасці нейкіх непрадбачаных абставін, выкліканых перабоямі з падачай газу, у тым ліку і, крый Божа, аварыі на газаправодзе, можна хутка зноў перайсці на мазут. Запасаў яго хопіць на некалькі тыдняў бесперабойнай работы.

— А як жа з забеспячэннем патрэбы ў прыродным газе непасрэдна самога Новалукомля? Наколькі ведаю, звадкаванага газу катастрафічна не хапае. Гарэлкі бытавых газавых пліт ужо цяпер «усхліпваюць», бы тыя астматыкі. На чарзе ўвод у эксплуатацыю яшчэ некалькіх шматкватэрных дамоў...

— Мяркуем, што і гэта праблема будзе ў хуткім часе вырашана. У самы бліжэйшы час пачнём падводку газапровада непасрэдна да горада. І тут значны аб'ём работ бярэ на сябе калектыў арэнднага прадпрыемства «Лукомльэнергамантаж». Але засмучае вось што: усе выдаткі па забеспячэнню горада прыродным газам лягуць на калектыў Лукомскай ДРЭС. У той жа час такія вялікія прадпрыемствы, як завод керамзітавага гравію, завод аб'ёмнага домабудавання і іншыя, не спяшаюцца ўзяць на сябе частку выдаткаў. А іх жа работнікі пражываюць у горадзе, карыстаюцца ўсімі тымі дабротамі, што і энергетыкі.

— І апошняе. І Вярхоўны Савет, і ўрад запэўніваюць нас: голаду, прынамсі гэтай зімой, у рэспубліцы не чакаецца. А як жа з забеспячэннем электраэнергіяй?

— Я не міністр энергетыкі і за ўсю рэспубліку адказваць не магу. Што датычыцца калектыву Лукомскай ДРЭС, які забяспечвае выпрацоўку амаль палавіны ўсёй электраэнергіі ў рэспубліцы, то магу зазначыць: мы зробім усё магчымае, каб перабояў з падачай электраэнергіі не было. Дзеля гэтага ўсімі сіламі імкнёмся ўсяляк павышаць надзейнасць і эканамічнасць станцыі.

Гутарыў
Уладзімір ГОЙТАН.

АСАБІСТАЕ

НА СЯМІ ВЯТРАХ

II.

Беларусі трэба тэрмінова вызначыцца ў прынцыпах свайго стаўлення да Польшчы на новым этапе еўрапейскай гісторыі. Па-першае, калі нарошчванне еўрапейскага вектара сілы ў палітыцы і эканоміцы Беларусі — бясспрэчны імператыў, то наколькі Польшча можа сёння быць «краінай, праз якую Беларусь ідзе ў Еўропу»?.. Менавіта такую ролю вызначыла для Польшчы ў час свайго візіту прэм'ер Х. Сухоцкая. Вядома, гэтыя словы — больш чым метафара ці простая канстатацыя геаграфічнага становішча.

Па-другое, як не дапусціць пры новым раскладзе сіл і новай ролі Польшчы парушэння раўнавагі ў знешнепалітычным акружэнні Беларусі? У першую чаргу, пэўна, гэта тычыцца адносін з Расіяй.

Гісторыя посткамуністычнага перыяду сведчыць аб тым, што цывілізаваная Еўропа будзе прырастаць паступова, уцягваючы ў сваю арбіту і інтэгруючы адну за адной краіны, па якіх прайшлася «аксамітная рэвалюцыя».

Бясспрэчна, што ў гэтым працэсе еўрапейскай інтэграцыі і рыначных трансфармацый эканомікі Польшча ідзе на некалькі гадоў наперадзе нас. Таму ігнараванне вопыту Польшчы было б цяжкай памылкай для Беларусі. Мы павінны з усёй прагнасцю, як мага больш і настойліва вучыцца ў палякаў рыначнаму і камерцыйнаму «ноў-хаў», як мага актыўней гандляваць і ладзіць бізнес-аперацыю. Бо палякі робяць усё гэта пакуль што лепш за нас. Але мы не можам дазволіць сабе некрытычнага пераймання польскай мадэлі, бо «шокавая тэрапія» не ёсць наш шлях у Еўропу. Па-першае, мы не маем такой раскошы, як тыя 40—50 мільярдаў долараў, якімі Захад заахвоціў палітычныя і эканамічныя рэформы ў Польшчы. Па-другое, у саміх палякаў цяпер галава баліць, як аднавіць зруйнаваную «шокавай тэрапіяй» нацыянальную прамысловасць. Для Беларусі такі курс быў бы раўназначны самазабойству і страце незалежнасці.

Польшча ўпэўнена займае першае месца сярод краін «далёкага замежжа» ў знешнегандлёвым абароце Беларусі. Пры гэтым у нашых двухбаковых эканамічных сувязях існуе велізарны незапатрабаваны патэнцыял. Паводле ацэнак беларускага прэм'ера Вячаслава Кебіча, прыведзеных у час знаходжання пані Х. Сухоцкай у Мінску, аб'ём беларуска-польскага гандлю толькі ў наступным годзе ўзрасце больш чым удвая. Такая перспектыва зноў жа не можа не цешыць. Але знешнеэканамічныя сувязі з Польшчай маюць пэўную абмежаванасць структуры, таму іх ніяк нельга абсалютызаваць.

Стратэгічная мэта эканамічнай рэформы на Беларусі заключаецца не ў тым, каб любымі спосабамі насыціць рынак таварамі масавага ўжытку, а ў тым, каб узняць да лепшых сусветных узораў узровень айчынных тавараў. І тут не абысціся без карэннай перабудовы нацыянальнай эканомікі на базе навейшых тэхналогій, прамысловага «ноў-хаў» і перадавога менеджмента.

На сучаснай Беларусі мала што засталося, што нагадвала б беспрасветную «мужыцкую Беларусь». На пачатку стагоддзя навукова-тэхнічны і інтэлектуальны ўзровень Беларусі імкнецца да еўрапейскага. Гэта таксама не пашкодзіла б усвядоміць нашым польскім партнёрам.

У галіне тэхналагічнага трансферу Польшча можа выступаць толькі ў ролі пасрэдніка. Гэтага нельга цурацца, але Беларусь павінна ўсталёўваць прамыя, без пасрэднікаў зносіны з носьбітамі перадавой тэхналогіі. Не Польшча, а менавіта Германія будзе выступаць стратэгічным саюзнікам Беларусі на тэхналагічным напрамку. І менавіта Германія, як ніякая іншая краіна, у стане адчыніць перад Беларуссю дзверы ў Еўрапейскае супольніцтва. І хоць гэта ўжо наступная тэма, але не магу не засведчыць, што бясконцае адцягванне тэрміну беларуска-германскай сустрэчы на вышэйшым узроўні з'яўляецца самым недаравальным правалам знешняй палітыкі Беларусі. Пры ўсіх спасылках на аб'ектыўныя абставіны.

Як неафіцыяльная асоба дазволю сабе выказацца напрамкі — празмернае захапленне Польшчай можа мець негатыўныя наступствы для адносін Беларусі з Германіяй, улічваючы традыцыйныя абертоны польска-германскіх адносін. І сёння насцярожанасць Польшчы да Германіі можна прасачыць, напрыклад, у нядаўнім, не вельмі абстаўленым дыпламатыяй выразе польскага прэзідэнта Л. Валенсы, які прадказаў Польшчы 10 гадоў спакойнага жыцця, пакуль аб'яднаная Германія занята сваімі ўласнымі праблемамі.

Польскія арыенціры ў сваёй палітыцы адносна Захаду мы павінны, прынамсі, узгадняць з перспектывай развіцця беларуска-германскіх адносін. Гэта не рэверансы перад Германіяй, гэта рэальнасць, якую, дарэчы, адзначаюць і амерыканскія палітолагі. «Беларусь разам з краінамі Прыбалтыкі ляжыць у зоне ўплыву вялікіх дзяржаў Расіі і Германіі».

У пэўным сэнсе тут мы знаходзімся ў адной лодзе з Польшчай, якая таксама зведвае магутны ўплыў з абодвух бакоў. Тым больш недарэчнымі могуць здацца прагучаўшыя ў апошні час з боку польскіх афіцыяльных асоб заявы, якія маюць незавуаліраваны антырасійскі характар. Адным з апошніх у гэтым шэрагу стаіць выказванне аб пагрозе з Усходу неабходнасці перадыслакацыі польскіх фарміраванняў, якое зрабіў падчас візіту да берагоў Тэмзы міністр нацыянальнай абароны Польшчы Я. Онышкевіч. Сімптаматычна, што заява міністра мела месца пасля серыі кансультацый у Лондане і Вашынгтоне.

Складваецца ўражанне, што пэўныя палітычныя колы на Захадзе не супраць таго, каб разыграць з дапамогай Польшчы расійскую карту. Падобны настрой, відаць, захапіў і асобных натаўскіх стратэгаў, якія раілі нам, беларусам, «інтэрнацыяналізаваць» нашы праблемы з Расіяй на манер Прыбалтыкі. Такія парады нагадваюць ужо ўмяшанне ва ўнутраныя справы, да таго ж, гэта проста дыпламатычная нетактоўнасць.

У рэшце рэшт справа самой Польшчы (як, дарэчы, і прыбалтыйскіх дзяржаў, якія на асабістым горкім вопыце зведалі вынікі канфрантацыі з Расіяй. — **А. М.**) вырашаць, прымаць ёй падкідваемую з Захаду гульню ці не. Мы не бяромся даваць Польшчы парады, нагадаем толькі, што ў яе сучаснай гісторыі досыць было трагічных момантаў, калі яна трапляла паміж молатам і кавадлам. Што датычыцца Беларусі, дык яна, упэўнены, не павінна дазваляць ніякай двухсэнсавасці ў сваёй пазіцыі — любая несправакаваная канфрантацыя з Расіяй будзе Беларусі толькі на шкоду. І тут, зноў жа ўпэўнены, беларускім палітыкам належыць цвёрда рукой адводзіць усе спробы ўцягнуць Беларусь у антырасійскія акцыі. Свае праблемы з Расіяй мы вырашым самі, без дапамогі звонку.

Роля Расіі і роля Польшчы ў справе мацавання суверэнітэту Беларусі, фарміравання нацыянальнай беларускай эканомікі, падтрымання, нарэшце, яе жыццяздольнасці — несуразмерныя, і такімі яны застануцца на бліжэйшую перспектыву. Толькі бязглуздая палітычная фанабэрыя ці рэцыдыў «Рэчы Паспалітай ад мора да мора» можа правакаваць процідзеянне Расіі і Польшчы ў беларускіх справах.

Зноў жа спашлюся на амерыканскіх палітолагаў Дж. Пілата і У. Потэра, якія слушна зазначаюць, што Беларусь, праводзячы курс на збліжэнне з Усходняй Еўропай, павінна выключыць любое абвастрэнне адносін з Расіяй. Да гэтай высновы іх прывялі, вядома, не прарасійскія сімпатыі, а жорсткі рэалізм і навуковая непрадузятасць.

Расія і ніхто іншы пакуль што выступае гарантам непарушнасці нашых межаў і жыццяздольнасці беларускай эканомікі. Таму, цвёрда адстойваючы свае нацыянальныя інтарэсы ў адносінах з Расіяй, мы павінны і надалей вырашаць існуючыя паміж намі праблемы мірам і паразуменнем.

Гэтак жа, як і з усімі іншымі краінамі-суседзямі.

Анатоль МАЙСЕНЯ,
выканаўчы прэзідэнт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных ініцыятыў «Усход—Захад».

(Заканчэнне. Пачатак у № 247).

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ АПЕРАТЫЎНА-ВЫШУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Гэты Закон вызначае змест аператыўна - вышуковай дзейнасці, рэгулюе адносіны бакоў у ходзе яе ажыццяўлення і ўстанаўлівае сістэму прававых гарантый прымянення аператыўна - вышуковых мер зыходзячы з прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, выканання канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

Артыкул 1. Аператыўна-вышуковая дзейнасць

Аператыўна - вышуковая дзейнасць з'яўляецца дзяржаўна - прававым сродкам абароны правоў, свабод, інтарэсаў, уласнасці грамадзян, грамадства, дзяржавы ад злачынных замахаў. Ажыццяўляецца адкрыта і тайна ўпаўнаважанымі на тое гэтым Законам дзяржаўнымі органамі і аператыўнымі падраздзяленнямі ў мэтах прадухілення і раскрыцця злачынстваў шляхам правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў.

Артыкул 2. Органы, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць

Права ажыццяўляць аператыўна-вышуковую дзейнасць прадастаўляецца:

органам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

органам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь;

аператыўным падраздзяленням пагранічных войск пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Органы, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, вырашаюць задачы, якія стаяць перад імі, самастойна, ва ўзаемадзеянні паміж сабой, а таксама пры садзейнічанні грамадзян.

Артыкул 3. Задачы аператыўна-вышуковай дзейнасці

Задачамі аператыўна - вышуковай дзейнасці з'яўляюцца абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян, выяўленне, папярэджанне, стрыманне і раскрыццё злачынстваў, ахова дзяржаўных сакрэтаў, вышук злачынцаў, якія схаваліся, без вестак прапаўшых грамадзян, а таксама забеспячэнне бяспекі органаў і асоб, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць.

Артыкул 4. Прынцыпы аператыўна-вышуковай дзейнасці

Аператыўна - вышуковая дзейнасць будуецца на аснове прынцыпаў законнасці, захавання правоў чалавека і свабод асобы, падкантрольнасці і падсправаздачнасці вышэйшым органам дзяржаўнай улады і кіравання.

Артыкул 5. Аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы

Для вырашэння прадугледжаных артыкулам 3 гэтага Закона задач органамі, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, прымяняюцца наступныя аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы:

апытанне грамадзян;

навядзенне даведак;

збор узораў для параўнальнага даследавання;

кантрольныя закупкі;

даследаванне прадметаў і дакументаў;

назіранне;

атаясамліванне асобы;

абследаванне памяшканняў, будынкаў, збудаванняў, участкаў мясцовасці і транспартных сродкаў;

кантроль паштова - тэлеграфных адпраўленняў;

укараненне супрацоўнікаў у арганізаваныя злачынныя групы і крымінагенныя аб'екты;

цэнзура карэспандэнцыі асуджаных;

праслухоўванне тэлефонных і іншых перагавораў;

слыхавы кантроль;

зняцце інфармацыі з тэхнічных каналаў сувязі.

У ходзе правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў выкарыстоўваюцца інфармацыйныя сістэмы, відэа- і аўдыёзапіс, кіна- і фотаздымка, а таксама іншыя тэхнічныя сродкі, якія не прычыняюць шкоды здароўю асобы і навакольнаму асяроддзю.

Службовыя асобы органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, вырашаюць ня задачы шляхам асабістага ўдзелу ў арганізацыі і правядзенні аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў, выкарыстоўваючы дапамогу службовых асоб і спецыялістаў, якія валодаюць навуковымі, тэхнічнымі і іншымі спецыяльнымі ведамі, а таксама садзейнічанне асобных грамадзян з іх згоды на адкрытай і тайнай асновах.

Арганізацыя і тактыка правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў складаюць дзяржаўную тайну.

Артыкул 6. Прававая аснова аператыўна - вышуковай дзейнасці

Прававую аснову аператыўна - вышуковай дзейнасці складаюць Канстытуцыя (Асноўны Закон) Рэспублікі Беларусь, гэты Закон, іншыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь. Органы, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, у межах сваёй кампетэнцыі ў адпаведнасці з гэтым Законам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь могуць выдаваць па ўзгадненню з Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь нарматыўныя акты, якія рэгламентуюць арганізацыю і тактыку правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў.

Артыкул 7. Гарантыі захоўвання правоў і свабод грамадзян

У працэсе ажыццяўлення аператыўна - вышуковай дзейнасці парушэнне канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян і дасягненне мэт і задач, не прадугледжаных гэтым Законам, недапушчальныя.

Асоба, якая лічыць, што дзеянні органа, які ажыццяўляе аператыўна - вышуковую дзейнасць, прывялі да абмежавання яе правоў і свабод, можа іх абскардзіць у вышэйстаячыя органы, пракурору або ў судовым парадку.

Асоба, вінаватасць якой ва ўчыненні злачынства не даказана ва ўстаноўленым законам парадку і якая лічыць, што ў адносінах да яе праводзіліся аператыўна - вышуковыя мерапрыемствы, мае права запатрабаваць ад органа, што ажыццяўляе аператыўна - вышуковую дзейнасць, звесткі аб характары атрыманай у адносінах да яе інфармацыі ў межах, якія дапускаюцца патрабаваннямі канспірацыі і выключаюць выдаванне дзяржаўнай тайны. Пры адмове ў прадастаўленні запытаных звестак асоба мае права абскардзіць гэтыя дзеянні ў судовым парадку.

У мэтах забеспячэння паўнаты і ўсебаковасці разгляду справы орган, які ажыццяўляе аператыўна - вышуковую дзейнасць, па рашэнню суддзі абавязаны прадставіць яму аператыўна - службовыя дакументы, што змяшчаюць звесткі, у прадастаўленні якіх было адмоўлена заяўніку, за выключэннем даных аб асобах, якія канфідэнцыяльна садзейнічаюць правядзенню аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

Атрыманыя ў выніку аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў матэрыялы ў адносінах да асоб, вінаватасць якіх ва ўчыненні злачынства не даказана ва ўстаноўленым законам парадку, захоўваюцца адзін год, а потым знішчаюцца, калі выкананне службовых абавязкаў або патрабаванні правасуддзя не патрабуюць іншага.

Артыкул 8. Падставы для правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў

Падставай для правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў з'яўляецца адна з наступных умоў:

1) наяўнасць узбуджанай крымінальнай справы;

2) звесткі, якія сталі вядомымі органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць:

аб проціпраўным дзеянні, якое рыхтуецца, учыняецца або ўчынена і па якому абавязкова расследаванне;

аб асобах, якія ўтойваюцца ад органаў дазнання, следства і суда або ўхіляюцца ад крымінальнага пакарання;

аб адсутнасці без вестак грамадзян і выяўленні неапазнаных трупаў;

3) даручэнні следчага, указанні пракурора або вызначэнні суда па крымінальных справах, якія знаходзяцца ў іх вядзенні;

4) запыты іншых органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, па падставах, указаных у гэтым артыкуле;

5) запыты міжнародных праваахоўных арганізацый і праваахоўных органаў замежных дзяржаў у адпаведнасці з дагаворамі (пагадненнямі) аб прававой дапамозе.

Органы, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, у межах сваёй кампетэнцыі маюць права таксама збіраць даныя, якія характарызуюць асобу грамадзян, неабходныя для прыняцця рашэнняў:

1) аб допуску да звестак, якія складаюць дзяржаўную тайну, ці да работ, звязаных з эксплуатацыяй аб'ектаў, што прадстаўляюць павышаную экалагічную небяспеку;

2) аб прыёме на службу ў органы, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, аб допуску да ўдзелу ў ёй ці доступу да матэрыялаў, атрыманых у выніку яе ажыццяўлення. Дадзенае палажэнне не распаўсюджваецца на суддзяў, следчых і пракурораў;

3) у сувязі з аказаннем імі садзейнічання ў падрыхтоўцы і правядзенні аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў;

4) аб выдачы дазволаў на прыватную дэтэктыўную і ахоўную дзейнасць.

Артыкул 9. Умовы правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў

Грамадзянства, нацыянальнасць, пол, месца жыхарства, сацыяльнае, маёмаснае і службовае становішча, прыналежнасць да грамадскіх аб'яднанняў, адносіны да рэлігіі і палітычныя перакананні асобных людзей не з'яўляюцца перашкодай для правядзення ў адносінах да іх аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не агаворана законам.

Правядзенне аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, што закранаюць тайну перапіскі, тэлефонных і іншых перагавораў, тэлеграфных паведамленняў, якія перадаюцца па тэхнічных каналах сувязі, недатыкальнасць жылля, дапускаецца толькі для збору інфармацыі аб асобах, якія рыхтуюць або робяць спробу ўчынення цяжкіх злачынстваў, учыняюць або ўчынілі цяжкія злачынствы, і толькі з санкцыі пракурора па матываванай пастанове кіраўніка (намесніка кіраўніка) адпаведнага органа, які ажыццяўляе аператыўна - вышуковую дзейнасць. У выпадку ўзнікнення яўнай пагрозы жыццю, здароўю, уласнасці асобных людзей, а таксама па заяве або са згоды грамадзян дапускаецца правядзенне ўказаных аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў на падставе пастановы, зацверджанай кіраўніком (намеснікам кіраўніка) органа, які ажыццяўляе аператыўна - вышуковую дзейнасць, з абавязковым паведамленнем пракурору на працягу 24 гадзін.

Іншыя віды аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, акрамя пералічаных у частцы другой гэтага артыкула, ажыццяўляюцца па матываванай пастанове, зацверджанай кіраўніком (намеснікам кіраўніка) органа, які ажыццяўляе аператыўна-вышуковую дзейнасць.

Ажыццяўленне аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў у адносінах да супрацоўнікаў, органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, праводзіцца з пісьмовага дазволу кіраўніка вышэйстаячага органа.

Забараняецца выкарыстоўваць канфідэнцыяльнае садзейнічанне на кантрактнай аснове народных дэпутатаў, суддзяў, пракураў, адвакатаў, свяшчэннаслужыцеляў і паўнамоцных прадстаўнікоў афіцыяльна зарэгістраваных рэлігійных аб'яднанняў.

Артыкул 10. Правядзенне аператыўнай праверкі

Аператыўная праверка праводзіцца з дазволу і пад кантролем кіраўніка (намесніка кіраўніка) органа, які яе ажыццяўляе. Вынікі праведзеных аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў адлюстроўваюцца ў аператыўна - службовых дакументах і сістэматызуюцца.

Аператыўна - службовыя дакументы павінны быць прадстаўлены пракурору пры ажыццяўленні нагляду або для атрымання санкцыі на правядзенне аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў.

Аператыўная праверка спыняецца ў выпадку вырашэння канкрэтных задач аператыўна-вышуковай дзейнасці, прадугледжаных артыкулам 3 гэтага Закона, а таксама пры ўстанаўленні абставін, якія сведчаць аб аб'ектыўнай немагчымасці вырашэння гэтых задач.

Артыкул 11. Выкарыстанне вынікаў аператыўна - вышуковай дзейнасці

Матэрыялы аператыўнай праверкі не з'яўляюцца падставай для абмежавання правоў і законных інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб.

Вынікі аператыўна - вышуковай дзейнасці могуць быць выкарыстаны для падрыхтоўкі і ажыццяўлення следчых дзеянняў і правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў па папярэджанні, стрыманню і раскрыццю злачынстваў, а таксама ў якасці доказаў па крымінальных справах у адпаведнасці з крымінальна-працэсуальным заканадаўствам і з'яўляцца падставай у адмове ў набыцці правоў і паўнамоцтваў для ажыццяўлення дзейнасці, прадугледжанай часткай другой артыкула 8 гэтага Закона.

Артыкул 12. Межы галоснасці ў аператыўна-вышуковай дзейнасці

Не падлягаюць выдаванню звесткі аб сістэме арганізацыі аператыўна - вышуковай дзейнасці, аб крыніцах, спосабах і метадах атрымання аператыўных матэрыялаў, а таксама даныя аб асабістым жыцці грамадзян, якія сталі вядомымі пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў.

Асобы, вінаватыя ў выдаванні гэтых звестак, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Выдаванне гэтых жа звестак супрацоўнікамі органаў, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, з'яўляецца парушэннем службовай дысцыпліны і служыць падставай для іх звальнення з органа.

Артыкул 13. Абавязкі органаў, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць

Пры вырашэнні вызначаных гэтым Законам задач аператыўна - вышуковай дзейнасці ўпаўнаважаныя на яе ажыццяўленне органы абавязаны:

1) прымаць у адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй усе неабходныя меры для абароны ахоўваемых законам правоў і свабод асобы, уласнасці, бяспекі грамадства і дзяржавы;

2) выконваць даручэнні следчага, указанні пракурора і вызначэнні суда аб правядзенні аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў па крымінальных справах, прынятых імі да вядзення, прадстаўляць матэрыялы аператыўна - вышуковай дзейнасці следчым пры расследаванні імі канкрэтных крымінальных спраў без выдавання крыніц аператыўнай інфармацыі;

3) выконваць на аснове дагавора і пагадненняў аб прававой дапамозе запыты адпаведных міжнародных праваахоўных арганізацый і праваахоўных органаў замежных дзяржаў;

4) інфармаваць іншыя органы, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, аб стаўшых вядомымі фактах проціпраўнай дзейнасці, якія адносяцца да кампетэнцыі гэтых органаў, і аказваць ім неабходную дапамогу;

5) захоўваць патрабаванні канспірацыі пры ажыццяўленні аператыўна - вышуковай дзейнасці;

6) забяспечваць бяспеку сваіх супрацоўнікаў, удзельнікаў крымінальнага судаводства, членаў іх сем'яў або блізкіх сваякоў, а таксама іх маёмасці ад злачынных або іншых проціпраўных замахаў.

Для належнага выканання службовых абавязкаў службовымі асобамі органаў, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, павінны быць забяспечаны ўмовы для атрымання спецыяльнай прафесіянальнай падрыхтоўкі, павышэння сваёй кваліфікацыі, для медыцынскага абслугоўвання.

Артыкул 14. Правы органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць

Пры вырашэнні задач аператыўна - вышуковай дзейнасці ўпаўнаважаныя на яе ажыццяўленне органы маюць права:

1) ажыццяўляць адкрыта і тайна аператыўна - вышуковыя мерапрыемствы, пералічаныя ў артыкуле 5 гэтага Закона;

2) устанаўліваць на бязвыплатнай або платнай аснове адносіны супрацоўніцтва з асобамі, якія далі згоду аказваць садзейнічанне на канфідэнцыяльнай аснове органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць;

3) ствараць і выкарыстоўваць інфармацыйныя сістэмы, якія забяспечваюць вырашэнне задач аператыўна - вышуковай дзейнасці;

4) выкарыстоўваць у ходзе правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў па дагавору або вуснаму пагадненню службовыя памяшканні, маёмасць прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, воінскіх часцей, а таксама жылыя і нежылыя памяшканні, транспартныя сродкі і іншую маёмасць прыватных асоб;

5) ствараць у мэтах канспірацыі легендаваныя прадпрыемствы, установы і арганізацыі, выкарыстоўваць у гэтых жа мэтах дакументы, якія зашыфроўваюць асобу службовых асоб, ведамасную прыналежнасць падраздзяленняў, арганізацый, памяшканняў і транспартных сродкаў органаў, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, а таксама асобу грамадзян, якія супрацоўнічаюць з гэтымі органамі на канфідэнцыяльнай аснове;

6) прымаць удзел у праверцы фінансава - гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і прыватных асоб;

7) патрабаваць, збіраць і вывучаць дакументы і звесткі, якія характарызуюць дзейнасць прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, а таксама спосаб жыцця асобных асоб, якія падазраюцца ў падрыхтоўцы або ўчынені злачынстваў, крыніцы і размеры іх даходаў;

8) атрымліваць ад юрыдычных і фізічных асоб бязвыплатна або за ўзнагароду інфармацыю аб злачынствах, што рыхтуюцца або ўчынены, якія пагражаюць бяспецы грамадства і дзяржавы.

Артыкул 15. Сацыяльная і прававая абарона службовых асоб органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць

На службовых асоб органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, распаўсюджваюцца гарантыі прававой і сацыяльнай абароны супрацоўнікаў тых органаў, у штаты якіх яны ўваходзяць.

Ніхто не мае права ўмешвацца ў законныя дзеянні службовых асоб і органаў, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, акрамя асоб, прама ўпаўнаважаных на тое законам.

Службовая асоба, упаўнаважаная на ажыццяўленне аператыўна - вышуковай дзейнасці, у ходзе правядзення аператыўна - вышуковых мерапрыемстваў падпарадкоўваецца толькі непасрэднаму і прамому начальніку. Пры атрыманні загаду або ўказання, якія супярэчаць закону, службовая асоба абавязана кіравацца законам, а калі ў яе ёсць падставы меркаваць, што ў выніку выканання загаду або ўказання можа ці магло быць учынена злачынства, паведаміць аб гэтым у вышэйстаячы орган і пракуратуру.

Артыкул 16. Садзейнічанне службовых асоб органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць

Службовыя асобы дзяржаўных і іншых прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, воінскіх часцей у рамках сваёй кампетэнцыі абавязаны аказваць садзейнічанне органам, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць.

Артыкул 17. Сацыяльная і прававая абарона асоб, якія садзейнічаюць органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць

Асобы, якія садзейнічаюць органам, што ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць знаходзяцца пад абаронай дзяржавы.

Пры ўзнікненні рэальнай пагрозы проціпраўнага замаху на жыццё, здароўе, маёмасць асобных людзей у сувязі з іх садзейнічаннем органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, а таксама членаў іх сем'яў або блізкіх сваякоў гэтыя органы абавязаны прыняць неабходныя меры па прадухіленню проціпраўных дзеянняў, устанаўлення вінаватых і прыцягнення іх да адказнасці.

Звесткі аб асобах, якія супрацоўнічаюць ці супрацоўнічалі з органамі, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць на канфідэнцыяльнай аснове, з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай і могуць быць даведзены да агульнага ведама толькі з іх згоды або ў выпадках, прама прадугледжаных законам.

Дзяржава гарантуе асобам, якія далі згоду садзейнічаць на кантрактнай аснове органам, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, выкананне абавязацельстваў, прадугледжаных кантрактам.

Перыяд супрацоўніцтва грамадзян у якасці асноўнага роду заняткаў па кантракту з органамі, што ажыццяўляюць аператыўна - вышуковую дзейнасць, уключаецца ў іх працоўны стаж. Указаныя асобы маюць права на пенсіённае забеспячэнне ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

У мэтах забеспячэння бяспекі асоб, якія супр

ВОЗГАЛАС

КАПЕЙКА РУБЕЛЬ ПЕРАСТАНЕ БЕРАГЧЫ

Аляксандр Пачынок, старшыня парламенцкай Камісіі па бюджэце, налогах і цэнах Расійскай федэрацыі, заявіў, што капейкі дажываюць свой век. Па яго словах, у кіраўніцтва Расіі перададзены праект адпаведнага распараджэння — аб округленні цэн. Аднак А. Пачынок рэкамендуе не выкідваць капейкі — «па той простай прычыне, што каштуюць яны значна больш свайго намінальнага кошту. Праз некаторы час яны стануць нумізматычнай рэдкасцю і будуць каштаваць у шмат разоў больш намінালу».

БелаПАН у сваю чаргу мае звесткі, што памянёнае распараджэнне не будзе падпісана, пакуль Вярхоўным Саветам Расіі не прыняты новы закон аб цэнах і цэнаўтварэнні.

БелаПАН.

НОВАЙ НАФТАБАЗЕ — НАФТАВЫ ФАНТАН

БАРАНАВІЧЫ. Баранавічы, як відаць, — горад аптымістаў, таму што нават у наш час усеагульнай неразбярыхі ў раёне на ўсю моц ідзе будаўніцтва дзяржаўных кватэр.

Але самай грандыёзнай будоўляй, напэўна, можна лічыць узвядзенне каля вёскі Новая Мыш нафтабазы. Аж на 400 тон.

Будаўнікі мабыць, лічаць, што на месцы іхняга збудавання хутка заб'е нафтавы фантан. Аптымісты, нічога не скажаш.

ОХ, ЗАРАЗА! ПУСЦІЦЬ З ТОРБАМІ АДРАЗУ

Па звестках, апублікаваных у газеце «Брестский курьер», для транспарціроўкі і захавання радыеактыўнага «аб'екта-802» спатрэбіцца 100 мільёнаў рублёў (без уліку інфляцыі). 50 мільёнаў выдзеліў расійскі Мінатамэнергапрам, 1 мільён 250 тысяч рублёў дае гарвыканком, выдзеліць грошы і вобласць. «Аб'ектам-802» у Брэсце называецца перавалка, дзе калісьці разгружаліся сакрэтныя грузы Міністэрства абароны СССР — у асноўным уранавая руда, якая перапраўлялася з краін Еўропы за Урал.

Яшчэ год назад усю зямлю з аб'екта (16 тысяч кубаметраў) збіраліся вывезці ў горад Жоўтыя Воды Днепрапятроўскай вобласці. Але цяпер граніцы закрытыя, і Украіна адмовілася прымаць гэты небяспечны груз. Таму распрацавана праектная дакументацыя на рэкультывацыю і захаванне заражанай зямлі на адным з ваенных палігонаў Брэсцкай вобласці.

БелаПАН.

ГУМАР АБ'ЯДНОЎВАЕ ЛЮДЗЕЙ

ДЗЯТЛАВА. Незвычайнае грамадскае аб'яднанне створана тут. Людзей з арыгінальным і нестандартным мысленнем, знатакоў добрага гумару прызваны аб'яднаць клуб Казьмы Пруткова, які адкрыўся пры раённым Доме культуры. Дарэчы, сюды запрашаюць не толькі «гумарыстаў», але і тых, хто нераўнадушны да вершаў, прозы, і наогул творчых людзей.

«ЭРМО» НЕ Ў ПРЫКЛАД ІНШЫМ

Другі па ліку магазін з'явіўся на Мінскім трактарным заводзе. Ён адкрыўся ў пасёлку трактарабудаўнікоў па вуліцы Грыцаўца і носіць назву «ЭРМО». Не, гэта не адна з тых гандлёвых кропак, якія прапануюць пад загадкавымі шыльдамі нізкагатунковы імпартны тавар. Назва «ЭРМО» паходзіць ад слова электрабудмантаж і стала візітнай карткай фірменнага магазіна, тавары якога выробляе арэндны калектыў электрарамонтнага цэха МТЗ.

Асартымент прылаўка тут хутка мяняецца, таму што «ЭРМО» пачаў прагназіраваць попыт пакупніка. Напрыклад, добра «пайшлі» бытавыя цялежкі для перавозу багажу, складныя лесвіцы, пераносныя лямпы для аўтааматараў. А яшчэ «ЭРМО» аказвае паслугі асобам і арганізацыям у рамонце бытавой тэхнікі, электрарувавікоў, зварачнага абсталявання, можа выконваць электрамантажныя работы для індывідуальных забудоўшчыкаў і нават адшукаць месцы пашкоджанняў кабелю.

Алег ПРАЦЬКО.

С. С. ШУШКЕВІЧ НЕ ПРЫВЁЗ У ГОРКІ НІ МАСЛА, НІ ЦЫГАРЭТ. ЁН ПРОСТА ХАЦЕЎ ПАРАІЦЦА З НАРОДАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

І ферма, безумоўна, выдатная, па амерыканскай тэхналогіі задуманая. Нават і заходзіць не было патрэбы, каб сказаць, што там чысціня, парадак і высокія надоі.

Старшыню вадзіў па ферме і даваў тлумачэнні дырэктар племгаса спадар Блахін. Адначасова са спецыяльнымі, ён даваў тлумачэнні свайго разумення сітуацыі ў сельскай гаспадарцы. Мікалай Рыгоравіч лічыць яе дрэннай, а выхад з яе бачыць у захаванні калектыўнай уласнасці. Тут адбылася невялікая тэарэтычная спрэчка. Старшыня пытаў дырэктара, што ён разумее пад калектыўнай уласнасцю, а той шчыра і проста адказаў: калгасы. На што Старшыня справядліва заўважыў: а чыя ў калгасе зямля, як не дзяржаўная? І дырэктар маўчаў. І адступаў назад: хто пераможа на выбарах, той няхай і аб'яўляе тую ўласнасць, якую хоча! На якіх выбарах — не ўдакладніў.

Затое пастараўся растлумачыць С. С. Шушкевічу, як слаба той разбіраецца ў сельскай гаспадарцы: значна горш, чым, скажам, у ядзернай фізіцы. Пасля чаго Станіслаў Станіслававіч элегантна спусціў яго на зямлю: «Карову ад свінні я адрозню».

Я нездарма пішу так падрабязна, бо, уласна кажучы, Старшыня таму і ехаў у Горкі, каб высветліць меркаванні людзей наконт зямельнай рэформы. Праўда, гэта не перашкодзіла яму наведаць Музей савецка-польскай баявой садружнасці, што ў вёсцы Леніна.

3.

Як ні дзіўна (а можа, якраз і нядзіўна?) вакол гэтага музея адбываюцца не зусім зразумелыя рэчы. Нібыта палякі ўжо не лічаць бой пад Леніна баявым хрышчэннем Войска Польскага, бо палякі ваявалі ў арміі Андэрса і шмат яшчэ ў якіх месцах. А пад беларускай вёскай было нешта радавое і нічым не адметнае. Усё праўда, але вось музей, вось могілкі, дзе пахаваны салдаты — польскія і рускія. Яны, канешне, не ведалі, што адбудзецца потым, яны проста ваявалі. І аб гэтым трэба памятаць, гэта нармальная рэч. Ненармальная — забыць і выкрасліць. Прыкладна так адказаў Старшыня на адно хітрае пытанне. Ён таксама завітаў у Леніна не таму, што тут раней быў Зянон Станіслававіч Пазьняк (ён аб гэтым не ведаў), а проста каб аддаць даніну памяці. Гэта адказ на другое хітрае пытанне. І правільны, на мой погляд, адказ.

4.

Мы зноў едзем у Горкі. На гэты раз — у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. С. С. Шушкевіч наведаў палігон акадэміі, дзе яму расказвалі аб новых распрацоўках у насенняводстве, паказвалі некаторыя навінкі ў галіне сельскагаспадарчага інвентару, якія вельмі добрыя, адкуль нідзе іх няма, бо не робяць, а не робяць, бо няма грошай, — словам, знаёмілі з тым, чым займаюцца і чым маглі б займацца, але... Але прынятая ў 1988 годзе пастанова ЦК КПБ аб развіцці БСГА так і засталася адной з пастаноў. І выканана, бадай, па адным толькі пункце: пабудавана памяшканне пад ваенную кафедру, якую ў наступным годзе закрываюць.

Уласна, такога ж накірунку гутарка працягвалася і ў Палацы культуры акадэміі, дзе сабраўся калектыў ВНУ, народныя дэпутаты раённага і гарадскога Саветаў, старшыні сельсаветаў, кіраўнікі гаспадарак і фермеры.

Гаварылі многа і на самыя розныя тэмы, а абагульніць, уласна кажучы, можна коратка: жыць дрэнна ва ўсіх адносінах. І даваліся прапановы, як жыць лепш.

У Старшыні Вярхоўнага Савета таксама ёсць сваё бачанне нашых праблем.

— У нас зараз толькі дзяржаўная ўласнасць на зямлю,— такі быў у Станіслава Станіслававіча ўстоп, які вызначыў тэму: зямля. Старшыня прызнаў, што Вярхоўны Савет паспяшаўся з прыняццем у першым чытанні праекта закона «Аб уласнасці на зямлю», што заканадаўцам наогул часта здараецца, быццам яны прымаюць правільныя законы, якія потым б'юць па галаве якраз тых, для каго і прымаліся. Гэта можа адбыцца і з законапраектам аб зямлі. Калі не пераканаць частку дэпутатаў у памылковасці іх поглядаў.

Давайце нагадаем: калгасам зямлю, так сказаць, падарыла дзяржава. Няхай гэта было несправядлівым — калектывізацыя, няхай пры гэтым праліўся акіян крыві, але гэта зямля ўсё ж такі дзяржаўная. Ды і чаго так пужацца прыхільнікам калгасаў, калі ў іх валоданні — 88 працэнтаў зямельнай плошчы рэспублікі, прыдатнай для сельскай гаспадаркі? Прыватнай уласнасці ж у нас практычна няма. Не лічыць жа за яе тыя няшчасныя 0,39 працэнта пад фермерскімі гаспадаркамі! І, шчыра кажучы, 100 працэнтаў не будзе ніколі. Таму што столькі сапраўдных гаспадароў не набярэцца нідзе, не толькі ў нас. Іх нямнога трэба, фермераў. Але яны павінны быць. І ім трэба даць магчымасць быць. А гэта можа адбыцца толькі пры адной умове: існаванні дзвюх форм уласнасці на зямлю — дзяржаўнай і прыватнай, аднак пры перавазе першай.

Карацей кажучы, усё гэта Станіслаў Станіслававіч гаварыў не аднойчы, тут нічога новага няма.

Справа, праўда, не ў гэтым, а ў тым, што літаральна днямі Вярхоўны Савет мае намер прыняць Закон «Аб уласнасці на зямлю». І Старшыня проста рыхтуе глебу. Можа гэта сведчыць аб тым, што ў ВС С. С. Шушкевіч ужо не бачыць сэнсу яе рыхтаваць? І застаецца адно: звярнуцца да народа. Не ведаю, можа і так. У мяне неяк не склалася ўражанне, што народ гэта хвалюе. Верагодна, у некаторых выпадках народ трэба ставіць перад адбыўшымся фактам. Для яго ж карысці.

На заканчэнне Старшыня Вярхоўнага Савета адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Пры дэфіцыце часу

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

размова ішла аб увядзенні кантрактнай сістэмы найму на працу. Адны катэгарычна выказваліся за абавязковае ўвядзенне гэтай даволі жорсткай формы, іншыя прыводзілі не менш важкія довады супраць. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Усе мы выйшлі з той, старой сістэмы, і толькі яшчэ робім першыя крокі ў рыначныя адносіны. Ці не таму многіх гняце цяжар старых уяўленняў у адносінах да новых рэалій часу.

Вядома, і спрэчкі, і процілеглыя прапановы патрэбны, усё гэта на карысць справе, бо прымаюцца законы, якія павінны працаваць гады, дзесяцігоддзі. І тут трэба расставіць па сваіх месцах кожнае слова, літару, нават коску, каб потым кожны раз не ўносіць чарговую папраўку. У рэшце рэшт дэпутаты паспяхова прайшлі праз церні вострых спрэчак і даволі дружна прынялі і сам Закон, і пастанову аб увядзенні яго ў дзеянне.

Потым перайшлі да абмеркавання (дарэчы, таксама ў другім чытанні) праекта закона «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі». Зноў, як і напярэдадні, намесніку старшыні Камісіі па навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу Уладзіміру Заблоцкаму давялося, што называецца, адстойваць кожнае палажэнне, якое ўжо разгледзела і ў асноўным адобрыла камісія.

Надзвычай вострыя спрэчкі ўзніклі вакол прапановы аб стварэнні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіі. Зноў адны былі за стварэнне такога камітэта, які мог бы стаць каардынуючым цэнтрам у справе развіцця навукі, іншыя з не меншай катэгарычнасцю выступалі супраць гэтага, бо, на іх думку, падобных дзяржаўных структур і так зашмат. І тут ролю «трэцейскага суддзі» ўзяў на сябе Старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч, які аргументавана даказаў, што стварэнне камітэта па навуцы — яшчэ не гарантыя высокаэфектыўнага развіцця гэтай самай навукі. Ці не таму пытанне аб стварэнні гэтага камітэта так і не набрала неабходнай колькасці галасоў. А магчыма тут адыграла сваю адмоўную ролю і тое, што колькасці дэпутатаў у зале ледзь хапае для неабходнага кворуму. Ва ўсякім разе, пры галасаванні агульная колькасць пададзеных галасоў не перавышала 220. І гэта з 346 народных дэпутатаў! А ім жа неўзабаве давядзецца прымаць папраўкі да Канстытуцыі. І тут ужо простай большасці будзе мала, спатрэбіцца дзве трэці ад наяўнай колькасці. Каб падобнае наведванне здарылася ў школе, даўно б ужо паклікалі бацькоў. Але тут самі «бацькі», і клікаць няма каго.

Паколькі некаторыя артыкулы праекта закона «Аб асновах дзяржаўнай навукова-тэхнічнай палітыкі» так і не ўдалося ўзгадніць, яго зноў адправілі на дапрацоўку ў камісію.

Да перапынку дэпутаты паспелі таксама прыняць у першым чытанні праект закона аб унясенні змянненняў і дапаўненняў у Крымінальны кодэкс РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях, аб унясенні змянненняў і дапаўненняў у артыкул № 21 Закона РБ «Аб ветэранах», а таксама пастановы аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў РБ.

Уладзімір ГОЙТАН.

ПАСТФАКТУМ

Ці знойдуць Кебіч і Чарнамырдзін агульную мову?

У Расіі — новы прэм'ер-міністр. 54-гадовы кандыдат тахнічных навук Віктар Чарнамырдзін заняў гэты пост у выніку працяглай і драматычнай барацьбы паміж дэпутацкім з'ездам, з аднаго боку, і выканаўчай уладай на чале з прэзідэнтам — з другога.

Барыс Ельцын не адстаяў Ягора Гайдара, хоць і прыкладаў дзеля гэтага надзвычай энергічныя намаганні. Згадваючы пра шумныя скандалы і дэмаршы, якія адбываліся ў Крамлі на мінулым тыдні, міжволі задаеш сабе пытанне: «Дык ці варта было агарод гарадзіць, палохаючы свет рэакцыяй і рэанімацыяй камунізму, якія нібыта чакаюць Расію без Гайдара?» Пад націскам абставін Ельцын вымушаны быў адмовіцца ад Ягора Цімуравіча, якога лічыў незаменным на пасадзе прэм'ера, і тым самым фактычна прызнаў сваё паражэнне ў схватцы з заканадаўцамі.

Ці можна чакаць у блізкім часе значнай карэкціроўкі расійскай эканамічнай палітыкі? Безумоўна. Віктар Чарнамырдзін ужо ў першай сваёй кароткай прамове пасля выбрання заявіў, што ён — за паглыбленне рэформаў, але без далейшага збяднення народа. На практыцы гэта хутчэй за ўсё будзе азначаць тое, што працэс раздзяржаўлення, фарсіраванай прыватызацыі, свабоднага ўзлёту цэн на асноўныя стратэгічныя рэсурсы затармозіцца і абмяжуецца пэўнымі рамкамі, якія будуць кантраляваць урадам.

У пэўным сэнсе гэта, вядома, адкат назад. Аднак змест рэформаў і іх поспех наўрад ці вызначаюцца тэмпамі правядзення пераўтварэнняў. Хуткі тэмп, зададзены Гайдарам, балюча ўдарыў па расіянах. Перадышка, якую абяцае Чарнамырдзін, дазволіць перавесці дух.

Віктар Чарнамырдзін у мінулым — буйны гаспадарнік у галіне паліўна-энергетычнага комплексу. Некалькі гадоў узначальваў саюзнае міністэрства газавай прамысловасці. Ва ўрадзе Гайдара таксама займаўся гэтымі праблемамі. У свой час чатыры гады працаваў у апараце ЦК КПСС інструктарам аддзела цяжкай прамысловасці.

Чарнамырдзін — гэта фігура з'ездаўскага «цэнтра», «Грамадзянскага саюза», які аб'ядноўвае дырэктарскі корпус, буйных гаспадарнікаў, прадстаўнікоў ваенна-прамысловага комплексу. Па вялікім рахунку, менавіта яны выйгралі схватку за ўладу, якая разгарнулася на з'ездзе. І менавіта іх інтарэсы будзе адстойваць новы прэм'ер, які ў першым жа сваім інтэрв'ю на новай пасадзе паабяцаў падтрымку асноватворным галінам эканомікі і недвухсэнсоўна даў зразумець, што не дасць ператварыць Расію ў краіну лавачнікаў.

Што азначае новая асоба на вяршыні выканаўчай улады Расіі для Беларусі? Мяркую, што ўраду Вячаслава Кебіча намнога лягчэй будзе знаходзіць агульную мову са сваімі новымі расійскімі калегамі, чым гэта было раней. У беларускага і расійскага прэм'ераў, мяркуючы па ўсім, шмат падобнага не толькі ў біяграфіях, але і ў поглядах на прынцыповыя падыходы да рэформаў.

Надзвычай актуальная для нас праблема — ці не адбудзецца значнай змены курсу ў расійскай знешняй палітыцы? Сенсацыйны прамоўніцкі прыём Андрэя Козырава, выкарыстаны ім пазаўчора ў Стакгольме на нарадзе міністраў замежных спраў краін — удзельніц НБСЕ,— цалкам дасягнуў сваёй мэты. Міністры былі ў шоку ад змрочных перспектыў, намаляваных Козыравым у даволі нечаканай для дыпламата форме. Думаецца, аднак, што ў Расіі перамаглі не тыя сілы, якія возьмуць на ўзбраенне імперскія лозунгі крайне «правых» і крайне «левых». Прагматычны «цэнтр», відавочна, з меншым піітэтам будзе ставіцца да кожнага слова і жэста Захаду, аднак не пойдзе на неабдуманыя крокі, якія могуць абвастрыць адносіны з блізкімі суседзямі.

Валянцін ЖДАНКО.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна - вышуковай дзейнасці» з дня яго апублікавання.

2. Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачынасцю забяспечыць кантроль за ажыццяўленнем аператыўна - вышуковай дзейнасці і расходаваннем фінансавых сродкаў, якія выдзяляюцца на гэтыя мэты.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у двухмесячны тэрмін:

прыняць неабходныя прававыя акты па рэалізацыі палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аператыўна - вышуковай дзейнасці»;

забяспечыць перагляд і адмену міністэрствамі і ведамствамі, упаўнаважанымі на ажыццяўленне аператыўна - вышуковай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, нарматыўных актаў, якія супярэчаць гэтаму Закону.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

12 лістапада 1992 г. г. Мінск.

interfax ІНТЕРФАКС

З ЧАТЫРОХ АБВІНАВАЧАНЫХ ПА СПРАВЕ ГКЧП ДАДОМУ ВЯРНУЛІСЯ ТОЛЬКІ ДВОЕ

Як стала вядома «Інтэрфаксу», з чатырох вызваленых у панядзелак з-пад варты абвінавачаных па справе ГКЧП (А. Лук'янаў, В. Варэннікаў, В. Генералаў, Ю. Пляханаў) дадому змаглі вярнуцца толькі двое — Уладзімір Генералаў і Юрый Пляханаў. Анатоль Лук'янаў пакуль застанецца ў ведамасной бальніцы МУС. Стан яго здароўя вымушае жадаць лепшага, і ўрачы не рэкамендуюць перавозіць яго дадому.

Валянціну Варэннікаву ўрачы таксама не раяць пакідаць шпіталь імя Бурдэнкі, дзе ён праходзіць курс лячэння. Сваё 69-годдзе (у аўторак) былы першы нам. міністра абароны сустраў у бальніцы.

Як паведамілі «інтэрфаксу» ў прэс-цэнтры Генеральнай пракуратуры РФ, усе абвінавачаныя вызвалены без спецыяльных умоў. Ім толькі рэкамендавана не пакідаць месца пастаннай прапіскі і ўстрымацца ад каментарыяў па абставінах справы.

У КІШЫНЁВЕ ПАЛІЦЭЙСКІЯ ЗБІЛІ ДЭПУТАТА ПАРЛАМЕНТА МАЛДОВЫ

Як паведамляе інфармацыйнае агенцтва «Ольвія-прэс», дэпутат парламента Малдовы Іван Русу быў збіты ў паліцэйскім участку на чыгуначным вакзале Кішынёва, куды ён даставіў невядомага, які спрабаваў выкрасці ў яго чамадан. Ва ўчастку паліцэйскія разарвалі прад'яўленае ім дэпутацкае пасведчанне і нанеслі яму сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні.

Цяпер пацярпеўшы парламентарый знаходзіцца ў бальніцы са страсеннем мазгоў і двума зламанымі рэбрамі.

КУРС РУБЛЯ НА ММВБ КРЫХУ ВЫРАС

На таргах Маскоўскай міжбанкаўскай валютнай біржы, што адбыліся ў аўторак, курс рубля ў адносінах да долара крыху вырас і склаў 418 рублёў. На папярэдніх таргах ММВБ 10 снежня курс рубля да долара склаў 419 рублёў.

С. ШУШКЕВІЧУ СПОЎНІЛАСЯ 58 ГАДОЎ

Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Станіславу Шушкевічу 15 снежня споўнілася 58 гадоў. Як стала вядома карэспандэнту «Інтэрфакса» з крыніц бліжэйшага акружэння кіраўніка парламента, С. Шушкевіч не плануе праводзіць з гэтай нагоды пышныя ўрачыстасці. Удзень, у перапынках работы сесіі Вярхоўнага Савета, ён прымае віншаванні ад таварышаў па рабоце, а ўвечары мае намер запрасіць у госці некалькі сваіх бліжэйшых сяброў.

Агенцтва «Інтэрфакс» далучаецца да віншаванняў у адрас кіраўніка беларускага парламента.

ПАРЛАМЕНТ ТУРКМЕНІСТАНА ПРЫСВОІЎ ПРЭЗІДЭНТУ НІЯЗАВУ ЗВАННЕ ГЕНЕРАЛА АРМІІ

Парламент Туркменістана прысвоіў прэзідэнту рэспублікі Сапармураду Ніязаву званне генерала арміі. Сваё рашэнне дэпутаты матывавалі «вялізнымі намаганнямі і клопатам, што праяўляюцца прэзідэнтам аб ваеннаслужачых у забеспячэнні надзейнасці і аховы суверэннай дзяржавы».

Туркменскія парламентарыі таксама прынялі 5 законаў, у тым ліку аб нетрах, аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых і аб водпусках. Апошні заканадаўчы акт устанаўлівае, што штогадовы асноўны водпуск прадастаўляецца работніку на тэрмін не менш за 30 і да 40 каляндарных дзён з улікам працоўнага стажу. У асобных катэгорый працоўных ён можа складаць ад 37 да 60 дзён.

Пасяджэнне парламента 14 снежня працягвалася 35 хвілін.

У ВЫНІКУ АБСТРЭЛУ РАСІЯСКАГА ВЕРТАЛЁТА ЗАГІНУЛІ 20 ДЗЯЦЕЙ І 16 ЖАНЧЫН-БЕЖАНЦАЎ З ТКВАРЧЭЛІ

Паводле папярэдніх даных Міністэрства абароны Абхазіі, у выніку абстрелу расійскага верталёта ў панядзелак загінулі 20 дзяцей ва ўзросце ад 3 да 11 гадоў, 16 жанчын і 3 члены экіпажа. Пасажыры, што знаходзіліся на борце, былі бежанцамі з горада Ткварчэлі. Спісы загінуўшых вывешаны ў панядзелак на Цэнтральнай плошчы горада Гудаута.

Між тым у прэс-цэнтры Дзяржкамітэта РФ па надзвычайных сітуацыях «Інтэрфаксу» паведамілі падрабязнасці трагедыі. Паводле даных ДКНС, верталёт ляцеў у суправаджэнні расійскага самалёта СУ-25. Прыкладна ў 17.00 па мясцоваму часу па ім з зямлі была выпущчана цеплавая ракета. Па дакладу экіпажа самалёта, ракета трапіла ў левы рухавік верталёта.

Верталёт упаў на схіл гары і разбіўся каля сяла Лата Гульрыпшскага раёна. Суправаджаючы самалёт Су-25 нанёс ракетны ўдар па месцы пуску ракеты. Два самалёты Су-25, што вылецелі з аэрадрома ў Гудауце, таксама нанеслі ўдар па мяркуемаму раёну размяшчэння ракетнай устаноўкі.

Абхазскі бок усклаў адказнасць за тое, што здарылася, на грузінскі бок, таму што высакагорнае сяло Лата, насельніцтва якога складаюць грузіны (сваны), знаходзіцца пад кантролем грузінскай арміі з першага дня канфлікту.

У сваю чаргу галоўны штаб дыслацыраваных у Абхазіі грузінскіх войск заявіў, што грузінскія войскі не маюць да гэтага інцыдэнту «ніякага дачынення». Пры гэтым падкрэслівалася, што верталёт быў збіты над тэрыторыяй, якую кантралююць абхазскія фарміраванні.

Па паведамленнях з Гудауты, 14 снежня расійскі бок высадзіў дэсант — каля 40 чалавек — у раёне падзення верталёта. Сёння з Масквы чакаецца прыбыццё камісіі для высвятлення ўсіх абставін трагедыі.

А сейф той проста адчыняўся...

30 тысяч рублёў склала ў адзін з лістападаўскіх дзён гандлёвая выручка магазіна № 3 Жабінкі. Прадаўцы пакінулі яе ў незамкнёным сейфе, што дазволіла юнаму зламысніку элементарна яе адтуль выкрасці. Сейф у тэрміновым парадку зачынілі, але ўжо пусты... Вядзецца следства.

БелаПАН.

Ён фашыст і гэтым ганарыцца

Каля будынка Бутырскай турмы адбыўся мітынг Нацыянальна-патрыятычнага фронту «Памяць». Мітынгоўшчыкі патрабавалі вызвалення з-пад аховы аднаго з функцыянераў фронту — Н. Цяпкова, затрыманага 25 лістапада 1992 года ў час выкліку па павестцы ў Краснапрэсненскую пракуратуру ў сувязі са справай аб уварванні ў рэдакцыю газеты «Московский комсомолец». Гэты мітынг стаў працягам мітынгу, які адбыўся 5 снежня каля ўваходу ў парк культуры імя Горкага. У гэты дзень лідэр НПФ «Памяць» Дзмітрый Васільеў гучна заявіў: «Так, я фашыст, і гэтым ганаруся!»

БелаПАН.

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

Пакуль што ў пройгрышы толькі простыя людзі...

Выступаючы і перад дэпутатамі, і перад журналістамі па пытаннях барацьбы з арганізаванай злачынасцю, карупцыяй, старшыня КДБ Эдуард Шыркоўскі падкрэсліваў, што, прыводзячы тыя ці іншыя факты выяўленых неправамерных дзеянняў службовых асоб, Камітэт дзяржбяспекі не прэтэндуе на вынясенне абвінаваўчага прыгавору, ці аб'яўлення гэтай асобы злачынцам. Гэта справа суда і толькі суда.

Вельмі многім не даспадобы прыйшлося тое, што КДБ кінуў «камень галоснасці» ў балота «ціхай прыватызацыі» і спудзіў далёка не міфічных чарцей...

Па-рознаму рэагуюць на апублікаваныя вытрымкі з даклада старшыні КДБ розныя службовыя асобы, прадстаўнікі сумесных і малых прадпрыемстваў. Адны маўчаць, другія апраўдваюцца, трэція мяняюць назвы фірмаў, распускаючы старыя і ствараючы новыя. Але інфармацыя, што паступае ў КДБ, у тым ліку і аператыўная, красамоўна сведчыць аб тым, што ў многіх вышэйпамянёных прадстаўнікоў загаварыла пачуццё адказнасці, і, каб не сесці на лаву падсудных, яны пачынаюць прымаць меры «па выпраўленню хібаў» у дзейнасці органаў дзяржбяспекі.

Ужо толькі гэтыя моманты з'яўляюцца станоўчымі і выніковымі для КДБ, які зусім не зацікаўлены запаўняць «праветраныя камеры».

Што ж выклікала такую крыўду на КДБ у спадара Векшы? Няўжо тыя некалькі радкоў даклада, дзе быў названы С. Векша—начальнік упраўлення дзяржкамітэта па знешнеэканамічных сувязях, які з'яўляецца членам СП «Сандвік Бісоў» і з санкцыі якога інструментальным заводам сумеснаму прадпрыемству прададзена за 8 млн. рублёў абсталяванне, купленае за мяжой за 10,5 млн. долараў ЗША? Але ж гэта факт, супраць якога нічога нельга сказаць.

Мы прызнаёмся ў недакладнасці назвы дзяржкамітэта, дзе працуе С. Векша. І гэта не робіць гонару КДБ, ад імя якога прыносім сваё прабачэнне.

Калі, па словах таго ж С. Векшы, «член праўлення СП» зусім не тое, што «член СП», будзем лічыць гэта нейкай недарэчнасцю.

І ўсё ж відаць, што прычына гэтага абурэння іншая, як, зрэшты, і стратэгія: паказаць «некампетэнтнасць» КДБ, выклікаць негатыўную рэакцыю на дзеянні дзяржбяспекі і «адвучыць» яе займацца падобнымі справамі. Так, гэта справа—нялёгкая «даважка» да асноўных напрамкаў дзейнасці КДБ, і мы за яе, акрамя «шышак», нічога не атрымліваем. Але ж, паверце, мы не маем маральнага права праходзіць міма фактаў аграблення працаўнікоў і казачнага ўзбагачэння за іх жа кошт «дзелавых» людзей, заняпаду дзяржаўнай прамысловай вытворчасці, якая працуе на ўсіх, і часта крымінальнага росквіту камерцыйных структур, што абслугоўваюць групавыя і прыватныя інтарэсы. Агіднасць многіх МП, СП і інш. якраз і заключаецца ў тым, што, карыстаючыся недакладнасцю заканадаўства, маючы «падкаваных», да таго ж займаючых «моцныя» пасады «кансультантаў» і членаў праўлення, яны паспяхова прыкрываюцца заслонай законнасці ў сваіх учынках. І «рэнтабельнасць», і больш высокі заробак рабочых у гэтай сферы часцей за ўсё якраз і ажыццяўляюцца за дзяржаўны кошт і за кошт асноўных падаткаплацельшчыкаў - спажыўцоў страшэнна дарагой прадукцыі.

Палеміка па гэтых балючых для большасці людзей пытаннях можа быць вельмі працяглай.

Таму, вяртаючыся да СП «Сандвік Бісоў», нельга не спытаць: ці толькі за «дзякуй» члены праўлення будучага СП прыклалі «столькі намаганняў» для яго стварэння?

Чаму такі кампетэнтны кіраўнік МІЗа, як І. Кананові́ч, дапусціў, што найсучаснейшыя тэхналагічныя працэсы на заводзе выкарыстоўваліся толькі на 20%, а закупленае абсталяванне прыносіла адны страты?

Не было сыравіны са Швецыі? Але ж на МІЗе быў даволі значны звышлімітны яе запас з Германіі, а практыка сённяшняй работы СП паказвае, што абсталяванне добра працуе і на расійскай сыравіне!

— Добра, не будзем браць сённяшні курс долара і рубля, але і ў сакавіку 1991 іх стан добра высветліў агульную тэндэнцыю. Толькі простыя людзі трымалі на сваіх ашчадных кніжках сціплыя сродкі. «Дзелавыя» ж кінуліся ўкладваць грошы ў нерухомасць, а яшчэ лепш—у сродкі вытворчасці. Вы вельмі правільна заўважылі: паспрабуйце сёння купіць бохан хлеба за 16 капеек... Але ж яшчэ больш дзіўнай выглядала б спроба купіць сёння аўтаматычныя лініі коштам 10,5 млн. долараў ЗША за 8 млн. рублёў!

Дык чаму ж такая спагада да беларуска-шведскага СП, якое па працэнтах акцый (51% — шведскі бок, 49% — беларускі) трэба называць шведска-беларускім? Тым больш, што **ніякага дазволу ўласніка** (у той час Мінстанкапрама СССР, а зараз — Дзяржкамаймасці Беларусі) **на гэту здзелку няма.**

Дазвол намесніка міністра Мінстанкапрама СССР Б. Піваранкі ад 15.03.91 г. на стварэнне СП не з'яўляецца дакументам на перадачу ці продаж сумеснаму прадпрыемству асноўных сродкаў вытворчасці.

Ёсць і такое пытанне: чаму на абсталяванне, якое практычна так і не запрацавала на поўную моц, і тэхналагічную дакументацыю («ноу-хау») быў налічаны знос адпаведна на 20 і 40 працэнтаў? Можа, маральны? Але ж ёсць акт экспертызы, які сцвярджае, што «гэтае абсталяванне — унікальнае», і нават сёння не можа ісці гаворкі аб яго маральным старэнні.

Падагульняючы гэты пункт з абсталяваннем, трэба яшчэ адзначыць і тое, што факт яго перадачы (продажу) усплыў толькі пры рэвізіі ў сувязі з намерамі прыватызаваць МІЗ у жніўні 1992 года.

Коратка хацелася б засяродзіць увагу чытача і на тым, што ніякі калегіяльны разгляд пытання аб сумяшчэнні пасад у Дзяржкамзнешэканамсувязі не дае права на парушэнне пастаноў СМ Беларусі № 592Р ад 4.11.91 г. і № 163 ад 26.03.92 г., у якіх сказана аб недапушчальнасці сумяшчэння пасад кіруючых работнікаў у дзяржаўных і камерцыйных структурах.

Спадар С. Векша таксама адзначае, што многа працаваў па рэгістрацыі розных СП і хацеў, каб «Сандвік Бісоў» быў эталонам. Калі лічыць тое, што сёння з 623 СП у рэспубліцы толькі 20 працэнтаў працуюць у адпаведнасці са статутам, а яго «хроснае СП», маючы добры прыбытак, ухіляецца ад своечасовай выплаты падаткаў (запазычанасць складае больш за 2 млн. рублёў), то вынікі такога «плёну» — у наяўнасці.

Многіх не толькі радавых назіральнікаў, але і «бізнесменаў», пэўна, зацікавіў бы і такі факт: як можна атрымаць у арэнду 4292 м² вытворчай плошчы (будынкі з абсталяваннем, камунікацыямі) з правам выкарыстання пад'язных пуцей МІЗа за 10.704 рублі ў год (для даведкі: такую суму сёння выплачваюць многія фірмы за арэнду дзесятка — другога квадратных метраў плошчы ў месяц)?

Калі вярнуцца да замежных прадстаўнікоў, то таксама паўстае пытанне: чаму як мага лепш у нас ставяцца да іншаземцаў і як мага горш — да сваіх? Жывуць шведы бясплатна ў добраўпарадкаваным інтэрнаце МІЗа (можа, няма чым плаціць?), а свае ж, гаротнікі, плацяць штодзень да 40 рублёў! Можа, з прычыны сваёй «лагоднасці» кіраўнікі праўлення СП з боку замежнага партнёра рашуча адхілілі спробы рабочых сумеснага прадпрыемства стварыць там прафсаюз, дабіцца забеспячэння спецвопраткай?

Думаецца, хопіць прыводзіць прыклады. У пухлай папцы дакументаў аператыўнікаў ёсць матэрыялы аб тым, як выкарыстоўваюцца замежныя камандзіроўкі; якія «востра неабходныя» СП тавары купляюцца за мяжой за валюту, у тым ліку, напрыклад, легкавы аўтамабіль і... дрыль; як парушаецца Закон «Аб замежных інвестыцыях у Рэспубліцы Беларусь» і пастанова ВС РБ «Аб часовым парадку валютнага рэгулявання і правядзення валютных аперацый на тэрыторыі Р

«Інтэлігентнасць — гэта перш за ўсё сумленнасць...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Адкуль жа возьмуцца тыя нацыянальныя арыенціры, калі гісторыя самабытнага народа, які мае за плячамі многія стагоддзі развіцця сваёй культуры, у падручніках савецкага часу пачыналася... з 1917 года. А да гэтага, як сцвярджалі праімперскія гісторыкі, у нас былі толькі голад, холад, лапці і каўтун у галаве. Дастаткова сказаць, што Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына аб'яўляліся цемрашаламі.

Думаю, што падручнікі па гісторыі Беларусі, якія напішуцца цяпер, не трэба будзе перапісваць, а толькі дапаўняць новымі звесткамі, новымі слаўнымі старонкамі. І ў гэтым я зайздрошчу наступным пакаленням беларусаў, якія змалку будуць прычашчацца да жыццядайнай крыніцы — гісторыі свайго народа.

Сітуацыя, у якую мы трапілі, надзвычай складаная, але не безнадзейная. Патэнцыял мовы, культуры, які праз гады таталітарызму самаахвярна ахоўвалі прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, настаўніцтва (у асноўным, сыны і дочкі беларускай вёскі—нашай ратавальніцы!), немалы. Упэўнены, што ён будзе тою пляцоўкаю, на якой узнімецца светлы гмах беларускага Адраджэння. У нас ёсць з чым выйсці ў свет і сёння, а надалей набыткі культуры павінны стаць больш важкімі.

— Вычляняцца, выдзяляцца нам, беларусам, з таго полінацыянальнага складу, я сказаў бы — сплаву, які называецца— не-не, не Савецкім Саюзам, а славянскім братэрствам — відаць, і няварта, і проста не разумна. Размова, як вы разумееце, не пра выдзяленне Рэспублікі Беларусь з былой камуністычнай імперыі... Як, на вашу думку, захавацца нам у славянскім супольніцтве, і захавацца годна, скажам, на тым узроўні, на якім былі беларусы ў часы Залатога стагоддзя?

— Я ўпэўнены, што ніводзін беларус і не думае, як вы сказалі, «вычляняцца, выдзяляцца» са славянскай супольнасці. Гэта абсурдна. Мы спакон вякоў жылі і будзем жыць на сваёй зямлі поруч з суседзямі-славянамі: рускімі, украінцамі, палякамі, а яшчэ і з латышамі, літоўцамі. Куды ад суседзяў дзенешся, хіба што толькі на Месяц? Такія размовы, а яны ўсё ж вядуцца ў пэўных колах нашых «суперінтэрнацыяналістаў», не толькі абсурдныя, але і смешныя. Такім жа смешным выглядае і іхняе абвінавачванне беларусаў у нацыяналізме.

Наш народ паважаюць за ўсіх рэспубліках былога СССР за працавітасць, шчырасць, гасціннасць, душэўнасць, талерантнасць. Усюды, а мне даводзілася быць у самых розных мясцінах, калі толькі ты скажаш, што з Беларусі, то цябе сустракаюць як роднага. Але тыя ж людзі, прыязджаючы да нас, жахаюцца, наколькі занепала наша мова, знікла нацыянальнае аблічча рэспублікі. Стаў ходкім нават жарт: Беларусь—гэта яшчэ адна вобласць РСФСР. А гэта ўжо зусім не смешна.

А таму і радасна, што, нарэшце, мы пачынаем будаваць сваю незалежную дзяржаву, пра якую марылі шмат стагоддзяў беларусы. Нашы сувязі з братамі-славянамі не перарвуцца. Ці ж народы вінаватыя ў тым, што зрабілі з кожным з іх таталітарызм, ідэалагічны манапалізм, цэнтр-монстр, на які ўсе, як рабы, працавалі, які бязлітасна эксплуатаваў нацыянальныя землі, рэсурсы, саміх людзей?

А ведаеце, хто ўвесь час крычыць у Беларусі, што нацыяналісты хочуць пасварыць нас з рускім народам? Той, хто палец ад палец не ўдарыў, каб нешта карыснае зрабіць дзеля дружбы славянскіх народаў. І мяне часта абвінавачваюць у нацыяналізме. Дык вось, хачу сказаць сваім абвінаваўцам-«інтэрнацыяналістам»: пакуль вы крычыце, я перакладаю творы рускіх, украінскіх пісьменнікаў, друкую іх у Беларусі. Маю шмат сяброў у Маскве, Санкт-Пецярбурзе, Мурманску, Уладзіміры, Курску, Разані, Барнауле, а таксама ў Кіеве, Львове, Чарнігаве, Мікалаеве, Луцку і многа дзе яшчэ. Не крычаць трэба, не абменьвацца толькі заздраўнымі тостамі ў час выпадковых сустрэч, каб потым забыцца на суседзяў, а пастаянна рабіць на гэтую дружбу.

Так працуе і калектыў рэдакцыі часопіса «Полымя». Абменны нумар э украінскім часопісам «Вітчізна», падборка вершаў паэтаў Санкт-Пецярбурга, апавяданні пісьменнікаў Расіі— гэта толькі частка таго, што апублікавана за апошнія гады. Мы разумеем, што ў наш, набрынялы крывёю, жорсткасцю і варожасцю час, літаратура, культура могуць, як ніхто, плённа пракладваць шляхі ўзаемаразумення і сяброўства.

А што да нашай захаванасці ў славянскім коле, то беларуская літаратура і культура там добра вядомыя, нязменна карыстаюцца ўсюды ўвагаю і павагаю. І гэтая традыцыя, я ўпэўнены, не згасне, а будзе развівацца далей.

— Доўгі час культурай, літаратурай, навукай, журналістыкай і ў краіне, і ў рэспубліцы кіраваў ідэалагічны монстр. Кіраваў ва ўрон усяму беларускаму, нацыянальнаму—гэта, як казаў адзін літаратурны герой, факт. Галоснасць, дэмакратыя, суверэнітэт змялі, нарэшце, монстра. Ці лічыце вы гэта заканамернасцю? Больш таго, ведаючы, што вы, калі можна так мовіць, былі блізка да беларускай ідэалагічнай машыны, добра знаёмы з яе «машыністамі», хачу спытаць і вось аб чым: ці не маглі б вы сёння прыадчыніць сакрэтныя дзверы, патаемны ўваход на тую ідэалагічную кухню, дзе распрацоўваліся сцэнарыі таго, як трэба было бясціць і зневажаць Быкава, Адамовіча, іншых нашых «зорак», урэшце — і вас асабіста?

— Што ж, можам пагаварыць і пра гэта. Сапраўды, у былым СССР ідэалагічны манапалізм, на аснове якога і вырас той монстр, пра якога вы кажаце, як наручнікі і кайданы, скоўваў творчасць таленавітых людзей, якія працавалі ў самых розных сферах духоўнага жыцця. Прыкладаў можна прывесці безліч. Велізарны штат партыйных чыноўнікаў не толькі апрацоўваў грамадзян краіны ў зададзеным накірунку, але і пільна сачыў за інтэлектуальнаю элітаю грамадства — творчай інтэлігенцыяй. Яны заўсёды былі пад прыцэлам, як на этапе: крок—улева, крок — управа, буду страляць! Ствараць трэба было толькі ў межах «адзіна правільнай ідэалогіі».

Але і ў гэты час была іншая літаратура—літаратура на ўсе часы, створаная не вернападданніцкай фантазіяй, а мужным і праўдзівым талентам, дзе заўсёды прысутнічала імкненне бескампрамісна спасцігаць складаныя варункі нашай гісторыі, людзкога быцця, глыбока аналізаваць дабро і зло ў чалавеку, разглядаць характары герояў у самы складаны для іх час — момант выбару, зараджаць сэрцы чытачоў ідэямі гуманізму, справядлівасці і праўды. З гэтай кагорты беларускіх пісьменнікаў назаву толькі імёны тых, хто яе сімвалізуе: Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч.

У самы разгар кампаніі па цкаванні В. Быкава, разгорнутай партыйным чыноўніцтвам, ён атрымаў паштоўку ад выдатнага рускага паэта Аляксандра Твардоўскага, які заўсёды падтрымліваў нашага земляка і сябраваў з ім. Там была такая фраза: «Все минется, а правда останется».

Справядлівасць гэтых слоў бясспрэчная. І разбурэнне ідэалагічнай машыны па вытворчасці дэмагогіі, фальшу і хлусні, канешне ж, заканамернае.

Вы напомнілі, што я і сам быў вінцікам ідэалагічнай машыны. Газета «Европейское время» нават заявіла, што я працаваў у ідэалагічным аддзеле, што і я былы, які стаў сённяшнім. Дык вось, я не былы і не сённяшні, а заўсёдны. Усё сваё жыццё, пачынаючы са студэнцтва, у меру сваіх здольнасцей служу беларускай нацыянальнай культуры. Гэтым я займаўся і на пасадзе загадчыка сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ. Ішоў туды не кіраваць, а дапамагаць. Сектар літаратуры ніколі не выконваў за маю бытнасць у ім нейкіх цэнзарскіх функцый. Гэтым займаліся іншыя. А мне давялося пастаянна адстойваць чалавечую, грамадзянскую годнасць і творы лепшых беларускіх пісьменнікаў ад нападак не толькі мясцовых ідэалагічных цэрбераў, але і з апарата ЦК КПСС. Наша бяда была ў тым, што ў гэтым апараце працавала шмат землякоў: Зімянін, Шаура, Сяўрук і іншыя. Яны вельмі пільна сачылі за тым, што робіцца ў рэспубліцы, рэагавалі на «крамолу» імгненна. Не меней «шчыравалі» і свае ідэалагічныя «босы». Мой рабочы дзень у ЦК нярэдка пачынаўся такім тэлефонным званком: «Если ты еще раз перейдешь мне дорогу, то я сломаю тебе хребет...»

А таму ганаруся тым, што дапамагаў такім выдатным пісьменнікам, як Васіль Быкаў, Пімен Панчанка, Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч, Алесь Разанаў. Іншая справа, што не ўсё змог зрабіць. Вельмі шкадую сёння, што многія сур'ёзныя, грунтоўныя дакументы, як, скажам, праграмы развіцця нацыянальнай агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы, паляпшэння выдавецкай справы і іншыя, у распрацоўцы якіх удзельнічаў, былі пахаваны ў архіў, бо ў гэтым партыйнаму начальству бачыўся нацыяналізм. Такім чынам, згублена цэлае дзесяцігоддзе, за якое можна было зрабіць шмат чаго карыснага, хоць крыху спыніць нацыянальную дэградацыю, не зайсці ў тупіковае становішча.

Словам, я магу спакойна і адкрыта сёння глядзець у вочы людзям.

— Ідэалагічны бунт здзейсніўся, монстр памёр, гэта, вядома ж, добра. Дэмакратыя набіраецца сіл, хоць у нашай рэспубліцы — думаю, вы са мной пагодзіцеся — гэта адбываецца не так упэўнена, як хацелася б... Але ці верыце вы асабіста ў канчатковую і поўную перамогу дэмакратыі ў Беларусі? Каб не выглядала гэта пытанне нейкім падвохам, я растлумачу, чаму задаў яго. Мне здаецца, ёсць некалькі аргументаў, якія, так бы мовіць, папярэджваюць: сама дэмакратыя ў небяспецы. Па-першае, няпроста будзе паўстаць ёй у поўны рост, па-еўрапейску, з руін былога Саюза ССР... Падругое, што мне здаецца даволі істотным ва ўмовах нашай рэспублікі, вельмі ўжо разрознена, неяк па сваіх асяродках, трымаецца беларуская інтэлігенцыя, а менавіта ж яны — дзеячы культуры, літаратуры, мастацтва, настаўніцтва, навукоўцы — з'яўляюцца не толькі гордасцю любой цывілізаванай дзяржавы, але і праваднікамі рашучых пераўтварэнняў у ёй — ажно да ўсталявання новых форм кіравання... Агульнымі заклікамі да аб'яднання тут не возьмеш. Патрэбна, як мне думаецца, СВАЯ БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ, якая выразна акрэсліла б усім нам канчатковую мэту ў руху па шляху да сапраўднай дэмакратыі. Як лічыце вы?

Ачмураныя шматгадоваю артадаксальнаю бальшавіцкаю прапагандаю, нагнятаннем нянавісці да ўсяго дэмакратычнага і нацыянальнага, затуманы бегатнёю па чэргах з талонамі, задушаныя нястачаю і жабрацтвам, многія суайчыннікі віну за эканамічныя і іншыя беды звальваюць на дэмакратаў. Хочацца сказаць ім: людзі добрыя, адкрыйце свае вочы, паглядзіце вакол сябе! Хто сёння расцягвае наша з вамі, народнае дабро: скупляе за бясцэнак машыны, трактары, хто «прыхватызуе» ўсё, што трапіць пад руку, хто будуе шматпавярховыя асабнякі, катэджы, дачы, хто варочае сотнямі мільёнаў і набівае свае кішэні ў розных сумніцельных СП, хто правіць «пір у час чумы»? Дэмакраты? А дзе вы бачыце тых дэмакратаў у заканадаўчых і ўладных структурах? Жменька іх ёсць у парламенце, адзінкі ва ўрадзе, і так да самага нізу. Ці могуць яны рэальна ўплываць на становішча ва ўсіх сферах жыцця? Канешне ж, не могуць. Яшчэ адзін крок да дэмакратыі наша грамадства зробіць, калі будуць праведзены выбары з улікам сённяшніх рэалій, на прынцыпова новай аснове. І тут усё залежыць ад народа, ад яго свядомасці...

Наш народ доўга яшчэ будзе вызваляцца з путаў таталітарызму, пераадольваць свой страх, грамадзянскую палітычную пасіўнасць. Я часта сустракаюся з рознымі людзьмі, шмат дзе бываю і ведаю, які настрой пануе сёння ў гушчыні народа. Паўсюдна безліч кансерватыўна настроеных людзей: і ў горадзе, і, асабліва, у вёсцы. Кавалерыйскім наскокам гэты настрой не зменіш. Патрэбна актыўная, карпатлівая растлумачальная праца на абуджэнню свядомасці народа, падняцця ўзроўню ягонай палітычнай культуры. Вось тут многае магла б зрабіць беларуская інтэлігенцыя. Ды, зрэшты, ёю ужо нямала здзейснена. Шкада толькі, што вялікая частка самой інтэлігенцыі таксама кансерватыўная і пасіўная. Аднак, паўтаруся, зрух ёсць. Пэўнае яднанне інтэлігенцыі, каб аберагчы і даць магчымасць развіцця ператкам дэмакратыі, заўважаецца.

Але не спяць у шапку і процілеглыя сілы. Няўклюдныя нападкі, беспардонная хлусня ў адрас свядомай і актыўнай нацыянальнай інтэлігенцыі поўняць не толькі старонкі прабальшавіцкіх, але і праімперскіх газет, якія, як пустазелле, запаланілі пад вэрхал перабудовы і бязладдзя ўсю інфармацыйную прастору Беларусі. Іх атака на палітычную, эканамічную незалежнасць, суверэннасць рэспублікі, на беларускую мову, культуру становіцца апошнім часам усё больш нахабнай і цынічнай, бо «працуюць» яны, прымерваючыся да падзей, што разгортваюцца цяпер у доме «магутнага ўсходняга суседа». Многія абаронцы імперыі, як і ў час жнівеньскага путчу, ужо заданалены пляскаюць у ладкі.

Шлях да дэмакратыі цярністы і доўгі. На ім могуць быць узлёты і спады, але я веру ў свой народ, у тое, што ён пабудуе сапраўды дэмакратычную Беларусь. Гэтая мара, аплочана крывёю і пакутамі многіх лепшых сыноў і дачок народа, і яна павінна здзейсніцца.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

НАВІНЫ акцыянернага таварыства «БЕЛАРУСКАЯ АГРАПРАМЫСЛОВАЯ БІРЖА»

У сувязі з наступаючымі святамі біржавыя таргі адбудуцца 18, 22 і 29 снежня 1992 г., а таксама 5, 12, 15, 23 і 29 студзеня 1993 г.

Біржавым саветам прынята рашэнне аб правядзенні адкрытых таргоў у апошнюю пятніцу кожнага месяца (у снежні г.г. — 29 чысла).

Запрашаюцца прадстаўнікі калгасаў, прадпрыемстваў, арганізацый, фірм.

Для заключэння здзелак неабходна мець даверанасць і круглую пячатку.

На таргах у пятніцу, 11 снежня г.г., заключана 39 здзелак на суму 34,3 млн. рублёў.

Сярод купленых і прададзеных тавараў:

Назва тавару	Адзінка вымяр.	Цана за адзінку, руб.
Акцыя АТ "Белагрупрамбіржа"	шт.	45000—50000
Жыта харчовае	тона	22800
Дзіцячае харчаванне яблычна-гранатавае, слоік 250 г	слоік	41
Дзіцячае харчаванне з кабачкоў і яблыкаў, слоік 250 г	шт.	39
Казенакі	кг	200
Цукар-пясок	тона	144
Сок бярозавы і бярозава-яблычны ў слоіках па 3 л	слоік	36
Культыватар КВК-4	шт.	7000
Бензін АІ-93	літр	55
А/прычэп ГКБ-8328, новы	шт.	70000
Абліцоўка перад. ГАЗ-53 са шклапластыку	шт.	6270
Крылы да ГАЗ-53 са шклапластыку	шт.	2645
Азбест лісты 1,2×1,5, таўшчыня 10 мм	кг	100
Сельгасшына 6,5х16	шт.	8500
Стартэры для а/м ГАЗ-52, ЗІЛ-130, ГАЗ-53, ЗІЛ-130, Масквіч, Жыгулі	шт.	7500—8000
Пасажырскі транспартны сродак "Волгар" на базе ГАЗ-53	шт.	900000
Прычэпы 2ПТФ-4 (45 м. куб.)	шт.	130000
Паўпрычэп трактарны ОЗТМ-9555 (1ПСЭ)	шт.	75000
Керамзітабетонныя блокі	м. куб.	1600
Шкло пракатнае для цяплліц	кв. м.	150
Цеплагенератар ТГ-1,5	шт.	80000
Выпрамляльнік зварачны ВД-306, 300А	шт.	48000
Прывады да стартэра	шт.	350
Сетка агароджы з вуталка, 3×1,5 м	шт.	1000
Метал лісты, 3 мм, 1250×2500 мм, ЗПЗ	тона	26000
Колы да а/м РАФ	шт.	24500

АСТРАНАМІЧНЫ КАЛЯНДАР

Стралец

Працягваючы свой шлях па нябеснай сферы, 17 снежня Сонца ўвойдзе ў сузор'е Стральца і пакіне яго толькі 20 студзеня.

Стралец, згодна са старажытнагрэчаскай міфалогіяй, — гэта кентаўр (паўчалавек-паўконь) Кротас. Яго баіцца нават Скарпіён, у якога той цэліцца з лука. Паводле падання, дзікі і жорсткі Кротас захапіў гэты ўчастак неба, які пакінуў сабе мудры кентаўр Хірон — настаўнік многіх старажытнагрэчаскіх герояў, урач, паэт, музыкант і астраном. Адзін з міфаў сцвярджае, што менавіта Хірон стварыў першы зорны глобус і падзяліў Задыяк на сузор'і, каб дапамагчы арганаўтам у іх плаванні за залатым руном. Калі Хірон, выпадкова ранены стралой Геракла, што была атручана жоўцю Лернейскай Гідры, вырашыў падарыць сваю бессмяротнасць Праметэю і памерці, Зеўс захацеў змясціць яго на небе. Аднак у Задыяку для Хірона месца ўжо не знайшлося. Так з'явілася паўднёвае сузор'е Кентаўра (Цэнтаўра), вядомае многім па навукова-фантастычных творах.

Не менш цікавая і старадаўняя трактоўка аблічча Стральца — кентаўр з двума тварамі: адзін павернуты назад, другі — наперад. Гэтым ён нагадвае двухаблічнага рымскага бога Януса. Відаць, не выпадкова, бо гэта сузор'е як бы сімвалізуе канец старога года і пачатак новага. Прычым адзін твар Стральца глядзіць у мінулае, а другі—у будучыню.

Сузор'е перасякае паласа Млечнага Шляху. Вось чаму арабы бачылі ў гэтым месцы... страусаў: адзін ідзе на водапой, другі ўжо напіўся вады. Ракой лічыўся сам Млечны Шлях. А на некаторых сучасных зорных картах тут малююць заварачны чайнік. Млечны Шлях уяўляецца парай з яго носіка.

У напрамку сузор'я Стральца знаходзіцца цэнтр спіральнай зорнай сістэмы — нашай Галактыкі. Але яе ядро скрыта магутнымі аблокамі цёмнай газапылавой матэрыі і даступна для назірання толькі з дапамогай дасканалых астранамічных інструментаў. Стралец вельмі багаты зорнымі скапленнямі і туманнасцямі. Некаторыя з іх — «Амега», «Лагуна», «Трохраздзельная» — надзіва прыгожыя.

Нарэшце ў Стральцы знаходзіцца пункт зімовага сонцастаяння, адзначаны на картах знакам Казярога. Але менавіта ў Стральцы наша дзённае свяціла 21 снежня дасягне найбольшай аддаленасці ад нябеснага экватара.

Шкада толькі, што гэтае задыякальнае сузор'е заўсёды знаходзіцца нізка над гарызонтам, таму нават летам адшукаць Стральца нялёгка.

Уладзімір ЛАРЫЁНАЎ, астраном.

Згубленую пячатку ГМП «ТЭБО» лічыць НЕСАПРАЎДНАЙ.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АГЕНЦТВА РІД

RID

паблік рылэйшнз на Беларусі

тэлефон: (0172) 325569
факс: (0172) 325569

НАВІНЫ ДЛЯ ГАЗЕТ, РАДЫЁ І ТЭЛЕБАЧАННЯ

Агенцтва РІД.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

17 снежня

БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Рыцары неба». 12-я серыя.
9.15. «Знахар». Дак. фільм.
9.35. «Дзе ты быў, Адысей?». 2-я і 3-я серыі.
10.30. Гісторыя Беларусі. 11-ы клас
17.00. Мультфільм.
17.15. Вадзім Гацко — пераможца Рэспубліканскага конкурсу юных піяністаў.
18.00. Вязгаснае «Полымя». Да 70-годдзя часопіса.
18.40. «Пасля фінішу». Дак. фільм.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Дыялог амерыканскіх бізнесменаў.
19.45. «Адданасць». Супрацоўніцтва. Стараннасць — дэвіз акцыянернага таварыства швейнай фірмы «Міланіца».
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Рыцары неба». 14-я серыя.
22.00. На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Пасля заканчэння — НІКа; «Беларуская музычная восень».

КАНАЛ «АСТАНКІНА»

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.45. Фірма гарантуе.
8.00. Навіны.
8.20. «Кідзі-відзі».
8.35. «Імперыя». Мастацкі фільм. 3-я серыя.
9.25. Тэатральныя сустрэчы.
10.05. «Айбаліт і Бармалей». Мультфільм.
10.20. «Агідэль-92».
11.00. Навіны.
11.20. «Ігар Сававіч». 3-я серыя.
12.30. Мультфільм.
12.50. «Безыменная зорка». Маст. фільм. 1-я серыя.
14.00. Навіны.
14.25. Тэлемікст.
15.10. Блакнот.
15.15. «Пчала Мая». Мультфільм.
16.05. ...Да 16 і старэйшым.
16.45. Прэс-экспрэс.
17.00. Навіны.
17.25. Хакей. Міжнародны турнір на прыз газеты «Известия». Зборная Расіі — зборная ЧСФР. У перапынку — Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Лато «Мільён».
21.10. Мастацкі фільм «Вярбоўшчыкі».
22.40. Што абазначаюць вашы імёны? У перапынку (23.00) — Навіны.
0.30. «Імперыя». Мастацкі фільм. 3-я серыя.

КАНАЛ «РАСІЯ»

7.00. Весткі.
7.25. Час дзелавых людзей.
7.55. Без рэтушы.
11.00. «Санта-Барбара».
11.50. Настальгічныя вячоркі.
12.20. Паралелі.
12.35. Гандлёвы дом «Т. Ін. Ка.».
12.40. Сялянскае пытанне
13.00. Весткі.
14.50. Тэрмінал.
15.20. Студыя «Рост».
15.50. Там-там навіны.
16.05. Тэлефільм (Аўстрыя).
16.50. Кіпрас Мажэйка. Рэпартажы з НАТО.
17.20. Парламенцкі веснік.
17.35. «Макбет» у пастаноўцы Н. Баярчыкава.
18.35. Антракт. Спявае Святлана Лазарава.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.25. «Санта-Барбара».
20.15. У свеце аўта- і мотаспорту.
20.50. Спецыяльны камерцыйны веснік.
21.00. Ціхі дом.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.40. На сесіі ВС Расіі.
23.10. Ціхі дом (працяг).

РАДЫЁ

17 снежня

Апошнія паведамленні: 7.00, 10.00, 13.00, 15.00, 20.15, 23.00, 23.55.

7.00 — «Радыёфакт». 8.05 — «Супраць бяды — разам». 8.15 — «Вясковыя рэстані». 9.15 — «Натхнёнага сэрца парывы». Агляд літаратурнай пошты. 10.15 — для маленькіх. Я, Парахута. «Хвальні». «Хатнічок». 10.33 — «Казка старога дома». Радыёпастаноўка. 11.00 — радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная». 12.00 — «Апоўдні». 13.10 — музычны канал. 16.05 — «Рамантыкі». Для старшакласнікаў. 16.48 — «Школа загартоўкі». 17.00 — «Эканамічны дзённік». 17.15 — «На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Беларусі». Г. Гарэлава. Кантата «У год сусветнага пажару». 17.40 — «Ад нашага ўласнага карэспандэнта». 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — «Ваша думка, ваша прапанова». 19.40 — «Беларусь і свет». Міжнародная праграма. 20.05 — вячэрняя казка. 20.15 — «Пастфактум-радыё». 21.00 — «Ад шчырага сэрца». Музычная праграма. 22.00 — «Голас друга». Духоўная праграма. 22.15 — «Запрашаем на вечарынку, прысвечаную П. Вагрыму». Перадача з Дома літаратара. 23.10 — «Спартыўная арбіта». 0.00 — «Начны канал».

Наступны нумар «Звязды» выйдзе ў пятніцу, 18 снежня г. г.

ВАШ САД І АГАРОД

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў да друку Мікалай ЧАХОЎСКІ (тэл. 32-41-92).

Цыбуля на падаконніку

Пошта нашага аддзела сведчыць аб неспакоі ў лагеры агароднікаў. Асабліва сярод тых, хто хоча нешта выгадаваць на падаконніку. Вось і канкрэтныя пытанні: ці можна што-небудзь зрабіць у гарадскіх кватэрах у снежні—студзені? І наогул — калі высяваць пакаёвыя агуркі?

Зялёны канвеер павінен даейнічаць як найлепш і абавязкова без перапынкаў. У снежні і студзені садзіце цыбулю на пяро і караняплоды пятрушкі і сельдэрэю. Гэтыя культуры не вельмі патрабавальныя да святла. Прадукцыю дадуць у любым выпадку. І глеба для іх бярэцца звычайная. Карані можна змясціць нават у пілавінне якое, сістэматычна паліваецца, зрэдку даецца падкормка. Зялёныя парасткі разаўюцца з энергіі, якая была закладзена ў самім кораняплодзе ці цыбуліне.

Больш складана з агуркамі. Культура гэта патрабуе 8—10-гадзіннага інтэнсіўнага святла. У снежні дзень малы, а ўспомнім частыя туманы, снегапады, наогул пахмурнае зімовае надвор'е. Сонца стаіць невысока. Яго промні вельмі слабыя, каб даць патрэбную энергію раслінам. Таму ў снежні — студзені ўстрымаемся ад сяўбы. Вось у лютым становішча са святлом рэзка палепшыцца. Тады і можна будзе брацца за справу.

Зрэшты, хто ўмее наладзіць добрае электрычнае асвятленне (дзве магутныя лямпы дзённага святла на кожны падаконнік), экраны рассейвання, той можа паспрабаваць шчасця і на канцы гэтага ці ў пачатку наступнага года. Запомнім толькі, што акрамя надзейнага асвятлення (яно ў гэты перыяд галоўнае), патрэбна яшчэ і высокая вільготнасць паветра, высокаўрадлівая рыхлая глеба, частае паліванне. Калі ўсё зможаце забяспечыць — бярыцеся за справу.

Лечым бульбу

Часта здараецца так: купілі бульбу, зварылі. Спадабалася, бо сыпкая і вельмі крухмалістая. Хацелі б адабраць на насенне. Але здзейсніць задуманае не так проста, бо кожны клубень у густой сетцы паршы.

І ўсё ж з мноства клубняў адбярыце пасля стараннага мыцця найменш пашкоджаныя. Асаблівая ўвага — на раставыя пупышкі, якія заўжды бачныя на паверхні клубня. Вось гэтыя «вочкі» павінны быць чыстымі, дакладна акрэсленымі. Калі на іх парэзы, моцныя калоніі паршы, чорныя плямы, клубні лепш выкарыстаць на харчаванне.

Некалькі гнёздаў хваробы лёгка знаць тыльным бокам нажа — паскрэбці балячкі. Пасля клубні на 3 хвіліны апусціць у ваду з тэмпературай 50 градусаў. На будучых расточках такая «лазня» не адаб'ецца згубна, а карысць відавочная, бо адны грыбковыя хваробы знікнуць зусім, а іншыя будуць ледзь «дыхаць».

Клубні падсушыць двое-трое сутак пры пакаёвай тэмпературы. Пасля кожны загарнуць у паперу і вынесці ў памяшканне з тэмпературай +2 ці крышачку больш градусаў. Зрэдку назіраць, як паводзяць сябе вашы падапечныя. Хворыя і ніякаватыя на выгляд выкарыстоўваць у ежу.

У сакавіку пасадачны матэрыял яшчэ раз «выкупаць» на працягу 5 хвілін у вадзе, у якой папярэдне разведзены медны купарос (2—3 грамы на 1 літр). Абсушыць і пакласці на азеляненне на падаконнік. Перад самай пасадкай «папудрыць» попелам.

Звычайна клубні, якія прайшлі такую апрацоўку, развіваюцца вельмі шпарка. Яны рана пераходзяць на самастойнае харчаванне. Хворая матка ім нават не сніца. «Дзеткі» бываюць вельмі вялікія і ўжо без гэтай непажаданай надакучлівай паршы.

Пра ўгнаенні

(Працяг. Пачатак у нумары за 9 снежня г. г.)

Калі мы гаворым аб такім угнаенні, як торф, звычайна маем на ўвазе аднародную чорную, часта вельмі вільготную масу. Яна ўтваралася стагоддзямі. Спецыялісты дзеляць тарфянікі на верхавыя, нізінныя і змешаныя (ці яшчэ пераходныя). Угнаенні з верхавых і пераходных балот не маюць вялікай каштоўнасці. Часта яны вельмі кіслыя. Да таго ж, не багатыя на пажыўныя рэчывы. А вось для расады, калі іх узбагаціць макра- і мікраэлементамі, падыдуць. Між іншым, усім вядомая тарфяная сумесь «Дзвіна» якраз і рыхтуецца ў асноўным з такога матэрыялу.

Найлепш — нізінныя тарфянікі. Іх асушаюць і здабываюць торф. Усе бачылі вялізныя піраміды торфу. Такім спосабам ён рыхтуецца на ўгнаенні. Шкодныя рэчывы выветрываюцца, недаступныя раслінам элементы сілкавання становяцца даступнымі.

Дзеянне торфу ўзмацняецца, калі ён пасля прасушкі і праветрывання пройдзе праз кампосты, дзе будзе ўзбагачаны гноем.

Гэта рэкамендуецца яшчэ і таму, што ў торфе мала фосфару і асабліва калію, што і папоўніць гной (вадкі і цвёрды).

Вельмі добра замульчываць праветраным дробным торфам пасеяную моркву, пятрушку, чарнушку на сявок, агуркі, буракі, фасолю і многія іншыя культуры.

На дачных участках і ля вясковых хат ямы туалетаў абавязкова прысыпаюць торфам. Змесціва гэтых ям прымяняюць для міні-кампостаў. Пасля году-двух вылежкі такі кампост можна выкарыстоўваць у садзе.

Зямля з дзярніны патрэбна ў асноўным для парнічкоў і нарыхтоўкі сумесі для расады. На пачатку вясны выбіраецца кавалачак зямлі са цматгадовым густым травастоем. На ім не павінна быць пырніку, дзьмухаўцу, конскага шчаўя, крапівы, іншага злоснага пустазелля. Наразаем дзярніну пластамі да 10 сантыметраў. На пляцоўцы ля дачы (1×1 м) кладзём гэту зямлю травою ўверх і засыпаем гноем. Наступны слой ладкуем травою ўніз і зноў слой гною. Так да вышыні аднаго метра (можна менш). Кожны слой дзярніны добра апльваем даламіткавай мукой, вапнай ці мелам.

За лета гэту «фабрыку ўгнаенняў» некалькі разоў трэба паліць разведзеным каравяком, два разы пералапаціць. Да восені выспее выдатная дабаўка да расаднай зямлі.

Лісцевая зямля ўтвараецца шляхам разлажэння лісця дрэў. У многіх выпадках яна з поспехам замяняе гной і кампост. А якая вырастае капуста! Прыгодная яна для бульбы, цыбулі, памідораў. Бульба літаральна «шалее» на такой глебе. Парасткі лёгка прабіваюць рыхлае асяроддзе. Багацце карысных рэчываў у вельмі даступнай форме гоніць у рост клубні.

Як рыхтаваць такую зямлю? Вельмі проста. Восенню лісце, траву, сцяблінны раслін, паперу, смецце складваем у агароджаную дошкамі ці нейкімі шчытамі скрыню. Пальём гноевай жыжкай ці растворамі мінеральных соляў, хатнімі адходамі. Двойчы перакопваем, імкнучыся верхні слой апусціць уніз, а ніжні — падняць «нагара». За год ці паўтара маса перапрэе, разложыцца, стане сухаватай і вельмі рыхлай. Угнаенне гатова.

Да добрых арганічных рэчываў трэба аднесці розныя хатнія адходы, нават пыл з вуліц. Апошні ўтрымлівае нямала азоту.

Каштоўнымі бываюць **глістыя мясціны вадаёмаў.** У глеі ўтрымліваецца ад 6 да 30 працэнтаў перагною! І найлепш прадстаўлена незаменная тройца — азот (0,25—2,0 працэнта), фосфар (0,25—0,5) і калій (0,2—0,8 працэнта). Пры гэтым верхнія гарызонты больш багатыя, ніжнія — бяднейшыя.

У выключных выпадках глей выкарыстоўваюць як угнаенне адразу з вадаёма. Але лепш прапусціць яго праз кампост.

НА ДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае надвор'е, месцамі невялікія ападкі, туман. Тэмпература паветра ў Гомелі — 1—3, у Мінску, Віцебску, Магілёве — 2—4, Гродна і Брэсце — 3—5 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак: 17 снежня ўдзень па захаду рэспублікі, 18 на большай частцы тэрыторыі ападкі. Тэмпература паветра 17 снежня ўначы ад 3 градусаў марозу да 2 градусаў цяпла, удзень — ад 0 да 5 градусаў цяпла. 18 снежня на працягу сутак ад 3 градусаў марозу да 2 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІ